Васіль Сцепанюк ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ДУБІНЫ Ў БЕЛАРУСІ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 27 (2564) Год L | Беласток, 3 ліпеня 2005 г. | Цана 2,00 зл.

Свята беларускай культуры

Фота МІХАЛА КОСЦЯ

Пачаўся чарговы летні сезон мерапрыемстваў-фэстаў, арганізаваных Беларускім грамадска-культурным таварыствам, якія амаль штотыдзень будуць праводзіцца па ўсёй Беласточчыне. Гэта святы беларускай культуры, перш за ўсё — песні, так як першае, беластоцкае, XX Свята беларускай культуры, якое на пагорак Магдаліны пасярод Беластока прыцягнула больш за тры тысячы гарачых прыхільнікаў роднай песні, што шчыльна запоўнілі лавы амфітэатра.

У гэты раз аматары беларускай песні ў выкананні тутэйшых і рэспубліканскіх мастакоў спеваў больш чым заўсёды цікавіліся іншымі вырабамі культуры — і рукадзелля ўтворанага рукамі (са скуры, саломы, сена, драўніны...), і кнігай. Не змяншаліся, як заўсёды, чэргі перад машынамі, адкуль прадавалі свае касеты „Зорка" і „Прымакі", але слухачы не шкадавалі часу пастаяць перад сталамі, на якіх расклалі свае кнігі Янка Заброцкі з Цэнтра славянскай культуры ў Варшаве, які штогод і на ўсе фэсты прывозіць беларускія і праваслаўныя выданні, а таксама аўтары з Беларускага літаратурнага аб'яднання — старшыня „Белавежы" Ян Чыквін, Міра Лукша і Віктар Швед. Асабліва кнігі шаноўнага паэта-юбіляра карысталіся агромным зацікаўленнем, што бывалага не на адной такой сустрэчы плённага аўтара аж дзівіла. Мабыць, попыт на друкаванае роднае слова ці не ад надвор'я залежыць?

Пасля таго, як разагналіся чорныя хмары над амфітэатрам, на бясхмарным небе заззяла сапраўднае летняе сонца. Пяцігадзінны канцэрт пачаўся гімнам „Беласточчына" (з рэпертуару „Песняроў") у выкананні калектыву „Прымакі". Мерапрыемства традыцыйна адкрыў старшыня БГКТ Ян Сычэўскі. Звярнуў ён увагу на тое, што незалежна ад таго, што беластоцкія выданні, бы на злосць беларусам, зноўку наблыталі: або падалі ўчарашнюю дату мерапрыемства, або ўвогуле не інфармавалі пра Свята беларускай культуры, якое ўмацавалася і штогод прыцягвае вялікую публіку. „Мы ўсе ведаем, чаму!" — папракаў польскія медыі старшыня, але, пэўна, усё гэта здарылася з-за разгільдзяйства, недавучанасці ды некампетэнтнасці беластоцкіх пісакаў. Але ж Беласток — miasto miłosierdzia, і не будзем папракаць кагосьці за глупствы. Беларуская культура існуе насуперак таго, што камусьці здаецца, што можна спрабаваць яе спляжыць замоўчваннем, дэзінфармацыяй ці крыўляннем. Можа таму і наведваюць беларускія мерапрыемствы запрошаныя VIPы тыя, каму гэта даспадобы — праваслаўныя і беларусы, і тыя, каму беларусаў і праваслаўных галасы пойдуць у падтрымку, абяцаючы тое ж самае ўзамен. Так ці іначай, прыемнае спалучаецца з карысным, і няма чаго таму здзіўляцца. Бо так і павінна быць. Хоць „Беларусь" гэта справа „nie dla mięczaków", але хай асацыюецца з чымсьці вартым, каштоўным і проста прыемным. А найбольшая прыемнасць на Свяце — паслухаць музыку ў выкананні пару дзесяткаў знакамітых ансамбляў.

Спачатку выступілі школьныя і маладзёжныя калектывы з Нараўкі, Бельска, Гайнаўкі, пасля хоры і калектывы — „Крыніца", „Каласкі", „Рэчанька", „Лучына", „Расспяваны Гарадок", „Арляне", „Каліна", „Асенні ліст", „Прымакі", „Маланка"... Словы песень вядомыя публіцы і малым, і старэйшым. „Можа, маеце нейкія беларускія спеўнікі?" — часта пыталіся гледачы ў пісьменнікаў, якія не толькі прадавалі свае кнігі, але і іншыя зборнікі. З нотамі, ці без нотаў — такая кніжачка была б найбольшым гітам на фэстах! Новыя песні пачуліся ў гасцей фэсту — дзіцячага вакальна-танцавальнага ансамбля „Лялечкі" з Абухава (на здымку).

— Можа, мне і нечага зайдросціць? — меркаваў дзядзька Уладзімір Цэтра з Кашалёў (родам з Тапаркоў) у Арлянскай гміне. Прадаваў ён свае вырабы з саломы ды сена, вядомыя ў музеях ува ўсёй Польшчы. — Нараблюся, але і паказацца люблю. Прыемна час правесці. Добра паесці, пагуляць, паслухаць песні. А найлепш у файнай кампаніі.

Міра Лукша

«Талеруюць» мову... ☞ 2

Ганна Кандрацюк

Дырыжор ды кампазітар Ежы Максымюк напісаў твор „In medio stat virtus" з лібрэтам на польскай, лацінскай і беларускай мовах. Задума трохмоўнага музычнага падарунка настолькі шакіравала беластоцкіх польскамоўных журналістаў, што ні словам не заікнуліся пра падзею. Затое ахвотна распісваліся пра татарскі пірог „перакачэўнік"...

... культуру... ☞ 2

Мацей Халадоўскі

У рамках „Дзён Беластока" не знайшлося месца на прэзентацыю мясцовай беларускай культуры. Аказваецца, вось, што культура „тутэйшых" беларусаў у ацэнцы мясцовых улад — не адзін з элементаў беластоцкай культуры, культуры беластачан...

... катакомбы... ☞ 4

Віталь Луба

Непрыхільнасць не толькі абмяжоўвалася да слоў, але праяўлялася і ў скандальных дзеяннях. Калі ўчастак пад катакомбамі стаў уласнасцю горада, бурмістр абгарадзіў яго, павесіў замок і 10 жніўня — на свята Супрасльскай іконы Божай Маці — не дапускаў праваслаўных служыць у гэтым месцы паніхіду...

... але мы не самі :-) ☞ 10

Алесь Белы („Наша Ніва")

Лёс беларусаў Падляшша важны як знак. Калі бязьлітасныя сківіцы польскай бюракратыі разжуюць і выплюнуць іх, тады ўсе нашы спадзяваньні на Эўропу марныя. Эўропа здолее дапамагчы толькі некаторым з нас — тым, хто заплюшчыць вочы на рэальныя праблемы — як беларусаў Польшчы, так і самой Беларусі — і будзе бясконца-бессэнсоўна паўтараць лібэральныя мантры, лісьліва зазіраючы ў вочы заходнім суразмоўнікам...

АЛЯКСАНДРА БЕРГМАН

(1 мая 1906 – 20 чэрвеня 2005)

Дзяячка Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, вязніца савецкіх лагероў (1935-1945), даследчыца беларускага нацыянальна-грамадскага руху, Беларускай сялянска-работніцкай грамады, аўтарка біяграфій беларускіх дзеячаў — закончыла свой зямны шлях 20 чэрвеня 2005 года.

Пахаванне адбылося 23 чэрвеня 2005 года на Яўрэйскіх могілках па вуліцы Акаповай у Варшаве. Над магілай прамаўлялі праф. Ежы Тамашэўскі і праф. Аляксандр Баршчэўскі, аб чым з сумам паведамляюць

дочкі Зофія і Элеанора

9 770546 196000

Роспач і Вера

Дзвесце, а то і болей, гадоў бязлітаснага вынішчэння беларускай нацыі ў сама жахлівых праявах (фізічныя забойствы дзесяткаў тысяч людзей, духоўная акупацыйная атрута, вываз нашых матэрыяльных каштоўнасцяў і культурных скарбаў, Чарнобыль і іншыя пошасці) могуць давесці да адчаю нават самага жыццясцвярджальнага і аптымістычнага чалавека. Такі фатальны пераслед, этнацыд гіганцкага маштабу, нібы здзек гістарычнага лёсу, перапыняўся толькі на нейкія карацюткія часы. Нацыя ніяк не магла распрастаць крылы і збудаваць незалежную Беларускую Дзяржаву. Само асэнсаванне такога працэсу не можа адмоўна не ўплываць на псіхіку чалавека, а рэчаіснасць штурхае яго ў прорву роспачы. З іншага боку, Бог дае чалавеку Веру як адзіны сродак уратавання. Можна сказаць, што сёння наша нацыя балансуе на хісткім мастку паміж адчаем і Верай.

Тая сістэма, якая створана зараз у Беларусі, мае на мэце якраз давесці чалавека да роспачы і нянавісці. Беларусам сёння няма месца ў Беларусі — мы не маем права аддаць сваіх дзяцей у беларускія садочкі і школы, не маем права ўзняць у нацыянальнае свята наш бел-чырвона-белы сцяг, не маем права выдаваць свае газеты, развіваць грамадскія арганізацыі і палітычныя партыі. Нас заганяюць у рэзервацыі, дзе таксама не даюць спакою і выштурхваюць у эміграцыю. А што ж там, на дэмакратычным Захадзе? Там ужо даўно давялі паняткі дэмакратыі да абсурду, збэсцілі і перакруцілі іх сутнасць. Там змагаюцца за правы сабак і ўзаконьваюць аднаполавыя „шлюбы" паміж збачэнцамі. Там круцяцца нейкія шалёныя, нерэальныя нават для ўяўлення звычайнага чалавека, грошы. Там таксама ўсё менш месца для сапраўдных хрысціянскіх, маральных вартасцяў і нацыянальных каштоўнасцяў. Зразумець сучасны еўрапейскі, такі вар'яцкі і самазнішчальны, лібералізм вельмі цяжка.

Быць Беларусам — цяжкое паклікане. Быць Беларусам — гэта адначасна вялікі гонар і вялікая ганьба. Гонар за славутае мінулае і сорам за цяперашняе. Як цяжка растлумачыць кожнаму замежніку тое, чаму мы так жывем сёння, чаму мы такія, чаму не можам адбараніць сваё. Як цяжка давесці свету, хто мы ёсць, бо гістарычная прапаганда суседскіх краін заблытала ўшчэнт этнічныя паняткі „ліцьвіны", „жмудзіны", „русіны", а ў канфесійных справах і дачыненнях цяжка разабрацца нават нам самым. Для абывацеля сапраўдная гісторыя нашай краіны — вялікая і незразумелая таямніца. Хто мы і адкуль узяліся на гэтай зямлі — ці не рытарычнае пытанне? Навакольная ж рэчаіснасць такая, што адны суседзі нас не любяць, а іншыя абыякавыя да нашага беларускага лёсу.

Акупацыйная ўлада (а як яе яшчэ можна назваць, калі яна па ўсіх прыкметах і дзеях такая?!) у нашай краіне штодзённа мэтна і паслядоўна сее зерне грамадзянскай нянавісці, таўруе іншадумцаў, робіць з сапраўдных патрыётаў пракажоных, з культурнай эліты ізгояў. Свае пачынаюць нішчыць сваіх, суайчыннікі робяцца ворагамі. Акупацыйная ўлада нібы гіганцкі канвеер прадукуе рознага кшталту і калібру калабарантаў — хамаў, халуёў, стукачоў. Яна пераўтварае людзей у біямасу, якая альбо люта ненавідзіць усё сваё, беларускае, роднае (такіх, дзякуй Богу, значная меншасць), альбо абыякавая да нашай нацыянальнай бяды і да нашага беларускага болю. Хлусня і жывёльны страх дамінуюць у людскіх паставах і паводзінах. Над народам і далей эксперыментуюць, яго замбуюць, пераўтвараюць у паслухмянае быдла, з якім можна рабіць, што заўгодна. Дзяржаўны малох уяўляецца бязлітасным і гатовым да поўнага вынішчэння беларусаў. Здаецца, што чалавечай душы, нібы трапяткому матыльку над вогнішчам, няма паратунку.

Але гэтая жалезабетонная сістэма, збудаваная на захопніцкай хлусні і подласці, на крывавых традыцыях суворавых-мураўёвых-леніных-сталіных, на нянавісці і ненажэрнай празе паглынання чалавечых душаў, можа рассыпацца ўшчэнт, умомант і назаўсёды. Гэта адбудзецца толькі тады, калі наша Вера ў нашу Праўду пераадолее нашую гістарычную крыўду і нашу роспач.

Уладзімір Хільмановіч

Купалле, Беласток — перакачэўнік

— A u was to ładnie śpiewają! — часта кажуць пра беластоцкіх беларусаў жыхары Сувальшчыны. Нашы песні ім падабаюцца. Такі камплімент мне надзвычай даспадобы, прытым ён праўдзівы. Сувальшчына ў музычным сэнсе — слабенькая.

Напрыканцы мінулага тыдня я апынулася на польска-сувальскім Купаллі. Наладзілі яго ў старым млыне над ракой Шашупай (непадалёк яцвяжскага гарадзішча Шурпілы) працаўнікі Ландшафтнага парку. Мне прыпала роля этнаспявачкі з-пад Вялікага лесу — значыць Белавежскай пушчы. Песень з сімволікай млына ў нас процьма. Узяўшы пад увагу месца і яцвягаў, я падрыхтавала падляшскія песні з балцкай меладычнай структурай. Асабліва па лініі ракі Нарвы і ў наваколлі Белавежскай пушчы балцкія ўплывы моцныя — найбольш у рытуальных песнях.

Мяне цікавілі мясцовыя калектывы „Яцвяж" з мястэчка Елянева ды „Дановэ" (значыць, таксама Яцвяж). Паказалася, што спяваюць яны выключна мазавецкі фальклор, часта не арыгінальны і апрацаваны на эстраду. Згаданы гурт „Дановэ" — свайго роду дублет „Гасцей з вёскі Варшава".

Калі я закранула тэму арыгінальнасці напеваў, малады і сімпатычны лідэр „Дановэ" наёршыўся: „Niech pani nie wyobraża, że będę śpiewał jakieś litewskie wielogłosowe pieśni. O nie!"

Праз момант мне здалося, што я ў Беластоку...

Аднак пры вогнішчы, калі раз'ехаліся ўжо чыноўнікі і скончылася афіцыйшчына, калі на неба ўсплыў месяц у поўні ды запахнелі спелыя суніцы, над Шашупай залуналі спевы на розных мовах. Вядома, сувальскія „Яцвягі" спявалі толькі па-мазавецку. Спачатку мы наладзілі спаборніцтва па спевах, але ўжо пасля двух гадзін мне ўдалося пераспяваць яцвягаў. Дапамог таксама добры выпадак. На маім баку сталі мясцовыя жыхары (ведаю ўжо народныя песні з наваколля мястэчка Віжайны). Праўда, самай жаданай песняй была тут, напрыклад, не надта мазавецкая „Hej, sokoły!".

Сувальска-яцвяжскае Купалле, — сціплае ў параўнанні з нашым белавежскім. Дарэчы, яно мае іншы характар. Шмат месца адводзіцца адукацыі. Апрача песень важнае месца займаюць тут гутаркі пра людзей і ўрочышчы, з найбліжэйшага наваколля. Арыгінальнай задумай лічу танец з агнём, які выканалі сувальскія студэнты. Прытым, як і ў нас, дзяўчаты сплятаюць вянкі і пускаюць іх на ваду (пры нагодзе быў прадэманстраваны паказ звівання вянка). Наколькі рака Шашупа зліваецца з Нёманам і цячэ ў Балтыйскае мора, умовы для чаравання тут проста казачныя. Але з другога боку мясцовыя кавалеры, як тыя яцвягі ў бой, кідаюцца ў ваду і не прапусцяць ніводнага вянка. Сімпатыя між людзьмі загараецца вокамгненна і доўга ўтрымоўвае тэмпературу.

У тым жа часе, у Беластоку, выспеў цікавы музычны вянок. Мова пра Дні Беластока. Арганізатары ў гэты раз не запрасілі ні аднаго беларускага калектыву. Аднак беларускія матывы паявіліся... нечакана, і, так сказаць, у самай вабнай постаці. Сусветнай вядомасці дырыжор ды кампазітар Ежы Максымюк (выхаванец і прыяцель беларускага кампазітара Яна Тарасевіча) напісаў твор „In medio stat virtus" з лібрэтам на польскай, лацінскай і беларускай мовах. Паслухаць любімага музыканта з квартала Баяры прыйшлі тысячы жыхароў. Канцэрт адбыўся ў парку на Плянтах.

Задума трохмоўнага музычнага падарунка настолькі шакіравала беластоцкіх польскамоўных журналістаў, што ні словам не заікнуліся пра падзею (выключэнне: Беластоцкае тэлебачанне). Затое ахвотна распісваліся пра татарскі пірог „перакачэўнік".

Ужо не першы раз назіраю смешную, хоць хітранькую вылазку. Заўсёды, калі ў Беластоку выспявае вартасны беларускі матыў, супраць нам ставяць татаршчыну. Пра канцэрт Ежы Максымюка пісалі ў адну дудку — што скрыгічуць мікрафоны. Ці можна ярчэй адлюстраваць крывадушнасць?

Ганна Кандрацюк

Вачыма еўрапейца

Дзе Рым, дзе Крым

Са свайго роду зайздрасцю аглядаў я ў тэлебачанні ўрачыстасці адкрыцця Могільніка Арлянят у Львове. З зайздрасцю, бо быў я ў пэўнай свядомасці таго, якая далёкая дарога чакае да паяднальных ці братэрскіх жэстаў у польска-беларускіх адносінах. У так далікатнай тэме, як Львоўская некраполія, у частцы Лычакоўскага могільніка, які ўвекавечвае палякаў палеглых у змаганні з украінцамі ў 1918-1919 гадах і ў польска-савецкай вайне 1920 г., удалося незалежна ад усяго дасягнуць кампраміс. Без сумнення, быў ён магчымы дзякуючы аранжавай рэвалюцыі і падтрымцы, якой гэтаму зрыву далі польскія ўлады і грамадства. Незалежна ад асабістага ангажавання і прыхільных адносін прэзідэнта Віктара Юшчанкі, не абышлося без спроб тарпедавання працягваючыхся ад пару гадоў стараннаў у справе адкрыцця могільніка, асабліва Вярхоўнай Радай Украіны, якая пару дзён да ўрачыстасцей рэкамендавала Гарадской радзе Львова адмовіцца ад згоды на адкрыццё некраполіі. Канчаткова ўкраінскі парламент адмовіўся ад свайго рашэння, а Львоўская гарадская рада справы не разглядвала. Тым не менш стала ясна, што ацэнка падзей блізка дзевяностагодовай даўнасці на Украіне — неадназначная. Таксама як і ў Польшчы. Галоўным чынам гаворка аб галоўнай пліце некраполіі: „Tu leży żołnierz polski poległy za Ojczyznę". Украінскі і польскі бакі адобрылі яго пасля доўгіх перамоваў і меншых кампрамісах, такіх як адмаўленне ад вяртання каменных ільвоў (сімвалу перамогі), якія былі на могільніку да II сусветнай вайны, і мяча „Шчарбца", падвешанага тады на Трыумфальнай арцы. Узамен на сваё месца вярнуліся помнікі французскіх пехацінцаў і амерыканскіх лётчыкаў.

Цяпер чарговыя выклікі, якія датычаць наладжання польска-ўкраінскіх стасункаў стаяць перад Польшчай. Вось справа добраўпарадкавання 50 ваенных украінскіх брацкіх месцаў пахаванняў, аб чым у апошні час успомніў м.інш. губернатар Львоўскай вобласці Пэтро Алійнык. Як казаў легендарны „берлінец", супрацоўнік парыжскай „Культуры" Ежы Гедройца, архітэктар польска-ўкраінскага збліжэння, украінец Багдан Асадчук, найважнейшае ў польска-ўкраінскіх адносінах — узаемны давер і тое, каб перамог Святы Дух і чалавечая мудрасць. У сваю чаргу Ян Новак-Езяранскі, былы шэф польскай секцыі Радыё Вольная Еўропа дадаваў:

— Благое мінулае не можа перашкаджаць у пабудове добрай будучыні.

Гэта на такім самым узроўні датычыць польска-беларускіх адносін. У гэтым, аднак, выпадку, яшчэ зарана. Справа тут не толькі ў палітыцы і яе выніках на найвышэйшым узроўні. Паралельна з дапамогай дэмакратычным сілам у Беларусі, варта, мабыць, пачаць ад прыкладнага ўшанавання беларускай меншасці ў Польшчы, на Беласточчыне. На жаль, гэта нялёгкая справа, паказваюць хоць бы апошнія Дні Беластока. У іх рамках не знайшлося месца на прэзентацыю мясцовай беларускай культуры (не блытаць — праваслаўнай, бо адзін канцэрт царкоўнай музыкі нават і атрымаўся). Што цікавае, беластоцкія ўлады сарганізавалі гэтую трохдзённую імпрэзу пад лозунгам „Białostocczanie na dniach Białegostoku", а яе арганізатары падкрэслівалі: „Гэта масавае мерапрыемства накіраванае да ўсіх жыхароў горада". Аказваецца, вось, што культура „тутэйшых" беларусаў у ацэнцы мясцовых улад — не адзін з элементаў беластоцкай культуры, культуры беластачан. Ну, што ж: „Дзе Рым, дзе Крым, а дзе мая айчына?" — як пытаўся Ян Чыквін.

Мацей Халадоўскі

Я лічу сябе беларусам і ва ўсіх дакументах заўсёды пісаў, што ў мяне беларуская нацыянальнасць. Да ніякай палітычнай партыі я не належаў. Прыступаючы да беларускага камітэта, я публічна акрэсліў сваю нацыянальную прыналежнасць...

Без рэвалюцыйных перамен

Размова з намеснікам бурмістра Гайнаўкі Васілём СЦЕПАНЮКОМ.

— Нядаўна Вы сталі працаваць на пасадзе намесніка бурмістра. Як доўга выношвалі Вы ідэю радных Беларуска-народнага выбарчага камітэта, якія запрапанавалі Вас на новую пасаду? (папярэдні намеснік бурмістра Міраслаў Мордань быў таксама кандыдатам БНВК).

— Прапанову кандыдаваць на пасаду намесніка бурмістра атрымаў я ў другой палове красавіка і спачатку разважаў ці рашыцца на вельмі адказную работу. Пераканалі мяне да яе сябры з Беларускага выбарчага камітэта, з якімі я разам балатаваўся на апошніх самаўрадавых выбарах як кандыдат на павятовага раднага. На новай пасадзе я працую ад 16 мая.

— Раней Вы працавалі ў Прадпрыемстве цеплавой энергетыкі ў Гайнаўцы. Ці гэта была Ваша першая работа?

— Так, гэта была мая першая праца, на якой я рабіў 24 гады. Пачынаў я працаваць у прадпрыемстве як электрамеханік. Люблю я гісторыю і завочна вучыўся на юрыдычным факультэце філіяла Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. У 1993 годзе закончыў я вучобу і стаў працаваць на пасадзе кіраўніка аддзялення па справах падаткаў, сацыяльнай апекі і працаўладкавання работнікаў.

— На папярэдніх выбарах Вы балатаваліся са спіска Беларуска-народнага выбарчага камітэта. Чаму Вы рашыліся падтрымаць беларускі камітэт?

— Я лічу сябе беларусам і ва ўсіх дакументах заўсёды пісаў, што ў мяне беларуская нацыянальнасць. Да ніякай палітычнай партыі я не належаў. Прыступаючы да беларускага камітэта, я публічна акрэсліў сваю нацыянальную прыналежнасць.

— Дзяцінства Вы правялі ў Чыжах і там закончылі падставовую школу. У якой ступені Ваша асяроддзе і школа паўплывалі на фарміраванне Вашай нацыянальнай свядомасці?

— Мае сямейнікі і ўсе людзі ў Чыжах гаварылі па-беларуску. На фарміраванне маёй свядомасці мелі ўплыў таксама ўрокі беларускай мовы, на якія я хадзіў у падставовай школе. Пасля паявілася зацікаўленне беларускімі кніжкамі. У маёй хатняй бібліятэцы ёсць беларускія кніжкі. Люблю я чытаць кніжкі аб гісторыі Беларусі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— На новай пасадзе Вы працуеце ўжо амаль паўтара месяца і напэўна паспелі пазнаёміцца з галоўнымі напрамкамі развіцця горада і планаванымі інвестыцыямі. Што, на Вашу думку, трэба рабіць у Гайнаўцы, каб паменшала беспрацоўе?

— У Гайнаўцы было многа звальненняў з працы ў вялікіх прадпрыемствах. Маладыя выязджаюць з горада і меншае колькасць жыхароў Гайнаўкі. Зараз прымаюцца на працу новыя работнікі, але іх колькасць невялікая. Выдатна абмежавала б беспрацоўе ў Гайнаўцы будова новага прадпрыемства. Аднак не размецім побач пушчы вялікай прамысловасці, бо будуць пратэставаць экалагі. У хуткім часе прадпрыемства „Фурнель" будзе будаваць вялікі прадукцыйны будынак і будзе прымаць на працу новых работнікаў. Ужо зараз у Гайнаўцы не хапае кваліфікаваных работнікаў, якія патрапяць працаваць у дрэваапрацоўчай прадукцыі. У Гайнаўцы трэба прапагандаваць разгортванне вытворчасці на аснове мясцовай сыравіны. Добра было б выкарыстаць сельскагаспадарчую прадукцыю з наваколля і дабрадзействы лесу — зёлкі, грыбы, ягады. У Гайнаўцы недастаткова развіты начлежныя і турыстычныя паслугі. Ёсць ідэя будовы гатэльна-турыстычнага комплексу, распаложанага непадалёк пушчы і нашай бальніцы. Аднак трэба знайсці інвестара на такую аграмадную інвестыцыю.

— Нядаўна кацельню прадпрыемства „Фурнель", якая будзе пастаўляць цеплавую энергію для амаль усіх жыллёвых блёкаў і многіх устаноў, купіла прадпрыемства з замежным капіталам „Rindipol". Што трэба зрабіць, каб інвестар, які фактычна з'яўляецца ў Гайнаўцы манапалістам у галіне ацяплення блёкаў, не перакінуў коштаў мадэрнізацыі велізарнай кацельні на пакупнікоў цеплавой энергіі і рэзка не павысіў цэн продажу цеплаэнергіі?

— Рашэнне ў справе продажу кацельні прымалася перад маім прыходам на працу на пасадзе намесніка бурмістра. Аднак усе выпадкі павышэння цэн цеплавой энергіі разглядае Установа рэгуляцыі энергетыкі. Яе працаўнікі правяраюць, у якой ступені вяртанне коштаў рэалізацыі інвестыцый і павышэнне коштаў прадукцыі знаходзіць адлюстраванне ў павышаных цэнах на цеплаэнергію. Я думаю, што УРЭ не дазволіць на вялікае павышэнне цэн на энергію прадукаваную прадпрыемствам „Rindipol". Прадпрыемства цеплавой энергетыкі будзе надалей пастаўляць цеплаэнергію, прадукаваную ў кацельні для індывідуальных пакупнікоў. Калі знікнуць апошнія квартальныя вуглевыя кацельні, ПЦЭ не будзе плаціць штрафаў за забруджванне асяроддзя і гэтым самым паменшаюць кошты яго дзейнасці.

— Раней гаварылася аб магчымасцях атрымання большасці сродкаў патрэбных для будовы крытага басейна ў Гайнаўцы з вонкавых крыніц. Ці магчымая будова басейна ў бліжэйшым часе?

— Я не займаюся справай гэтай інвестыцыі. Ведаю, што справа будовы басейна яшчэ нявырашана.

— Вам, як намесніку бурмістра напэўна вызначаны дзялянкі, якімі будзеце асабіста кіраваць у горадзе. Што Вы хацелі б зрабіць у сферы непасрэдна залежнай ад Вас?

— Я не прадбачваю праводзіць рэвалюцыйных перамен. Хачу, каб камунальныя прадпрыемствы, за якімі я буду наглядаць, былі рэнтабельнымі і маглі пахваліцца станоўчымі фінансавымі вынікамі. Могуць яны гэтага дабіцца выконваючы ў горадзе інвестыцыі. У гэтым годзе будзем пракладаць водаправоды і каналізацыю на новаствораных вуліцах. Прадбачваем асфальтаваць многа дарог, выканаць парк адпачынку і іншыя меншыя работы.

— Раскажыце крыху пра Вашу сям'ю.

— Мая жонка Ала працуе ў Павятовай установе працы ў Гайнаўцы. Сын Марыюш — студэнт першага курса юрыдычнага факультэта Універсітэта ў Беластоку, а сын Яцэк закончыў другі клас сярэдняй школы. Мае бацькі жывуць у Чыжах, а жонкі — у Семяноўцы.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

І сярод нас ёсць таленты

З увагай прачытаў я артыкул пяра Аляксея Мароза п.з. „У казачнай атмасферы", дзе аўтар прадставіў майго друга Мікалая Корха, які даволі даўно перабраўся з Чахоў-Арлянскіх на бацькоўшчыну ў Кархі і там, як гаворыцца, з пяці сваіх пальцаў пабудаваў сабе казачную сядзібу. У яго залатыя рукі і галава на плячах — ён усё ўмее зрабіць. Тое, што напісаў спадар Мароз, гэта ўсё праўда, але журналіст і так усяго не ў змозе ведаць пра свайго героя. А я свайго таленавітага равесніка Мікалая Корха ведаю здаўна — гэта культурны і вельмі скромны чалавек.

Можна паставіць пытанне: чаму ён, маючы такі выдатны мастацкі дар, не паступіў вучыцца ў далейшыя школы; у пачатковай школе ён быў выдатнікам. Здаецца мне, што ягонаму бацьку Яну Корху, на той час адукаванаму чыгуначніку на адказнай пасадзе, шкада было пакідаць найлепшую ў вёсцы гаспадарку на, як гэта гаворыцца, „произвол судьбы" і ён пакінуў спадчыну сыну. Так было ці інакш, але здольнасці майго сябра не змарнаваліся і ягонае майстэрства можа праяўляцца ў поўную сілу. У яго разумная і гаспадарная жонка і двух дарослых, культурных і адукаваных сыноў.

Варта прыгадаць, што Мікалай Корх быў калісь карэспандэнтам „Нівы", пісаў вельмі цікавыя допісы. Адзін з іх, пад загалоўкам „Вітаміны на санях", помню да сёння, як гэта зімою некаторыя садаўнікі на сваіх санях з запрэжаным конікам развозілі па вёсках яблыкі са сваіх садоў і вельмі танна іх, багатыя вітамінамі, прадавалі. Я маю такую надзею, што Мікалай Корх вернецца ў „Ніву" каб падзяліцца з яе чытачамі сваімі цікавымі думкамі.

Мала хто ведае, што дзед па маці Мікалая Корха Рыгор Масальскі быў у міжваенны час найдужэйшым чалавекам у наваколлі. Ён, гаварылі, ламаў у сваіх руках конскія дугі; сёння такіх людзей няма.

Мікалай Корх у мінулым быў радным Дубіцкай гміны і як мог, так дапамагаў людзям прабірацца праз нашы бюракратычныя лабірынты. Яго людзі шанавалі і надалей шануюць, бо ён дапамагае людзям у кожнай патрэбе, заўсёды дасць чалавеку разумную параду. Я жадаю яму і ягонай сям'і здароўя і паспяховага здзяйснення ўсіх планаў.

Мікалай Панфілюк

Дурныя законы або палітыка ЕС

9 чэрвеня г.г. на першай праграме тэлебачання двойчы пачуў я інфармацыю, што еўрапейскія палітыкі пастанівілі забараніць сялянам, пастаўшчыкам малака ў малачарні, на сваіх сядзібах гадаваць курэй, гусей, качак, сабак, катоў, мышэй ды пацукоў, каб не сутыкаліся яны з каровамі. Калі яны будуць сустракацца, то ад тых гаспадароў не будуць нашы малачарні прымаць малака! Тут трэба сказаць праўду, што селянін, які мае большы статак кароў, то гоніць яго на пашу пераважна з сабакам, каб суседзям не прычыніць шкоды.

Хатняе птаства можна ад кароў адгарадзіць сеткай, але ж будуць яны жыць як абвінавачаны ў турме за краткамі. Гаспадар без ката не можа абысціся, таксама як „мешчух" без ботаў не пойдзе босы па тратуары. У гарадах мышы ды пацукі дабіраюцца ў кватэры нават на чацвёрты паверх, а каровам будуюцца аднапавярховыя аборы, там ёсць корм, мука, збожжа і там разводзяцца мышы ды пацукі, і калі селяніну нельга трымаць ката, дык ён сам пацукоў і мышэй не вылавіць!

На маю думку, еўрадэпутаты такімі законамі хочуць знішчыць нашу гаспадарку дашчэнту. А калі нашы палітыкі адобраць гэты, па-мойму, „дурны" закон, то і так бедная сельская гаспадарка прападзе. А малако, мабыць, будзем рабіць з... аўса, там вада белая як малако. Нашым палітыкам трэба моцна задумацца над гэтым законам і наняць еўрадэпутатаў, каб прыехалі да нас лавіць мышэй і пацукоў.

Мікалай Лук'янюк

Рамонты ў Гайнаўскай гміне

Гайнаўская гміна — сельскагаспадарчая. Тут сяляне гадуюць многа малочных кароў. Ад пару гадоў усе вёскі маюць ваду з крана. Зараз кладуць каналізацыйныя трубы ў Дубінах і Ліпінах. Затым будуць пракладаць каналізацыю ў Навасадах.

Сёлета паложаць асфальт на дарозе з Новага Беразова ў Чыжыкі. Будзе больш адрамантаваных гравеек. З гэтай мэтай гмінныя ўлады купілі трактар з прычэпам ды грузчык.

У гэтым годзе правядуць рамонт будынка колішняй школы ў Барысаўцы і тут будзе вясковая святліца. Каля Трывежы пабудуюць невялікае вадасховішча. У Махнатым мясцовая добраахвотная пажарная каманда сёлета будзе святкаваць 70-годдзе свайго існавання. З гэтай нагоды ў вёсцы адкрыюць міні-музей пажарнай аховы.

У Гайнаўскай гміне шмат зроблена ў накірунку мадэрнізацыі вулічнага электраасвятлення, між іншым, у вёсках Ліпіны, Лазіцы, Арэшкава, Дубічы-Асочныя і Дубіны. У Дубінах аднавілі электраўстаноўкі на пяці вулічках і сёлета зробяць гэта яшчэ на адной.

(мох)

Прадузятая боязь

Фота А. ВАСІЛЮК — www.cerkiew.pl

Амаль восем гадоў спатрэбілася, каб супрасльскія катакомбы вярнуліся да законнага ўладальніка — Дабравешчанскага мужчынскага манастыра. 22 чэрвеня Рэгуляцыйная камісія па справах Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, якая дзейнічае пры Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі, вырашыла бясплатна перадаць участак і катакомбы манастыру. Рашэнне камісіі, якая выконвае ролю трацейскага суда, не падлягае касацыі і абскарджанню. Такім чынам шматгадовая валакіта закончылася паспяхова.

Прыгадаем, што да канца 1980-х гадоў манастыр і катакомбы былі казённай уласнасцю. У лютым 1996 года ўрад перадаў манастырскія будынкі адноўленаму ў 1989 годзе Дабравешчанскаму манастыру. Справа катакомбаў засталася нявырашанай. У красавіку 1997 года ўчастак пад катакомбамі стаў гміннай уласнасцю і манастыр пачаў хадайнічаць за іх вяртанне. Нягледзячы на прыхільнасць Управы гміны тадышні бурмістр не падпісаў рашэння аб перадачы катакомбаў манастыру. Тады таксама каталіцкі бок пачаў прапагандаваць ініцыятыву стварэння „экуменічных катакомбаў", на што не згаджаліся праваслаўныя, паколькі катакомбы стагоддзямі былі неад'емнай часткай манастыра. У 2003 годзе Супрасльская гарадская рада, прыняла пастанову аб перадачы катакомбаў манастыру, але частка радных абскардзіла гэтае рашэнне, у выніку чаго пастанова была Адміністрацыйным судом адменена. Паколькі вырашэнне справы на месцы аказалася немагчымым, справай занялася камісія ў Варшаве.

Шматгадовая цяжба — вынік непрыхільнага стаўлення каталіцкага боку да перадачы катакомбаў праваслаўным. У 2001 годзе рымска-каталіцкая парафія Святой Тройцы выйшла з ініцыятывай пабудаваць над катакомбамі экуменічную капліцу, дзеля „экуменічнага вырашэння праблемы паслябазыльянскіх катакомбаў з мэтай стварэння каталікам і праваслаўным магчымасці лёгкага і зручнага доступу да аб'екта", які быў бы ўласнасцю абодвух бакоў. Каталікі свае права на катакомбы тлумачылі іх прыналежнасцю да Каталіцкага касцёла ў мінулым. На касцельным сайце можна прачытаць, што „уніяты гэта ж каталікі ўсходняга абраду і на працягу больш за дзвесце гадоў манастыр быў у іх руках, а мясцовае насельніцтва ў значнай меры было гэтага ж абраду, значыць каталіцкае". Палемізуючы з выказваннем праваслаўнага святара, які на старонках беластоцкіх газет сказаў, што да 1849 года ў Супраслі не было каталікаў, ананімны аўтар на згаданай вэб-старонцы піша: „Можа не будзем тут прыпамінаць як гэтыя ж каталікі, асабліва ўсходняга абраду, станавіліся праваслаўнымі каля 1839 году". Аднак аб тым, як праваслаўныя станавіліся уніятамі пасля 1596 года аўтар ужо не піша.

„Каталікі баяцца, — чытаем далей, — што калі б гэтае месца перанялі праваслаўныя манахі, маглі б яны не ўшанаваць тых астанкаў, так як зрабілі гэта раней з касцямі фундатараў і уніяцкіх саноўнікаў з-пад адноўленай царквы". Затым даецца апісанне выпадку, калі пры аднаўленні царквы ў друзе апынуліся людскія косці, што, паводле аўтара, мела сведчыць аб варожым стаўленні праваслаўных да уніяцкіх астанкаў.

Непрыхільнасць не толькі абмяжоўвалася да слоў, але праяўлялася і ў скандальных дзеяннях. Калі ўчастак пад катакомбамі стаў уласнасцю горада, бурмістр абгарадзіў яго, павесіў замок і 10 жніўня — на свята Супрасльскай іконы Божай Маці — не дапускаў праваслаўных служыць у гэтым месцы паніхіду. Сваю забарону бурмістр крывадушна тлумачыў дрэнным станам тэхнічным катакомбаў і клопатам аб бяспецы паломнікаў. Цяпер, калі згодна польскаму праву рашэнне Рэгуляцыйнай камісіі з'яўляецца канчатковым, праціўнікі перадачы катакомбаў з ліку супрасльскіх радных не здаюцца. Задумваюцца ўжо як гэта абскардзіць карыснае праваслаўным рашэнне перад міжнародным трыбуналам у Страсбургу, хаця юрысты перакананы, што не маюць яны ніякіх шанцаў на адмену рашэння.

Урэшце надышоў час, калі супрасльскія манахі як законныя ўладальнікі змогуць спакойна заняцца аднаўленнем знішчаных часам і вандаламі катакомбаў і ўзвядзеннем над імі разбуранай у XIX стагоддзі Уваскрэсенскай царквы.

Віталь ЛУБА

Яшчэ пра выбары

Пра выбары пісаў я неаднолькава. Калі чытаю цяпер допісы з пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, то паўстае ўражанне што час як бы затрымаўся, хоць шанц на паспяховы выбар кандыдата ад Беларускага выбарчага камітэта або іншага кандыдата меншасці, большы чым калісь. А то па прычыне таго, што не кандыдуе ў Сейм Цімашэвіч. Калі рэдакцыя пазволіць зацытую самога сябе з допісу з „Нівы" ад 14 лістапада 1993 года, каб паказаць што тое, аб чым я пісаў дванаццаць гадоў таму, не патраціла актуальнасці.

„Палітык, які хоча быць выбраны беларусамі, мусіць штодзень быць пры іх, клапаціцца пра іх справы, турбавацца станоўча і пастаянна, шчыра і ўважна ўслухоўвацца ў іх галасы. Фэстыны, святкаванні і фестывалі — гэта не спосаб, каб прыцягнуць людзей да сябе. Святкаваць можна, але пасля цяжкай і плённай працы".

Выбары ў Сейм, гэта ўжо не што іншае як палітыка. І то палітыка большага маштабу. Для палітыкі патрэбныя палітыкі. Паўстае пытанне ці мы іх маем. Мы, значыць, беларусы. І ці нам, як беларусам, патрэбны якасны палітык, палітык на дзяржаўным узроўні. Не паказваючы пальцам, палітыканаў у нашым асяроддзі многа. Да таго ахвотныя „падзарабіць" на палітыцы да зарплаты таксама знойдуцца.

Але не ў тым справа. Перш за ўсё трэба акрэсліць мэту нашай палітыкі. Нашай, значыць Беларускага выбарчага камітэта. Мэта, якая будзе зразумелая ўсім: і маладым, і старэйшым выбаршчыкам. Да выбараў трэба ісці з акрэсленай ідэяй. Тут не можа быць выпадковасці. Затым з якой ідэяй маюць ісці ў народ кандыдаты ў паслы? Гэта і ёсць галоўнае пытанне. Іншыя, значыць апазіцыя, ідуць з татальнай крытыкай існуючай зараз улады, паказваючы ў сваіх праграмах, што яны куды лепш пакіруюць дзяржавай, чым сённяшняя ўлада. Калі ўжо людзі дапусцяць іх да ўлады, то напэўна яны зробяць усіх шчаслівымі. Пенсіянеры атрымаюць больш грошай чым цяпер, бо цяпер не хоча іх даць Бальцаровіч з камандай. Рабочыя і сяляне атрымаюць не толькі што трэба, але і больш, не гаворачы ўжо пра беспрацоўных, бо іх проста не будзе. То ж у параўнанні з іншымі, зусім прымітыўна будуць выглядаць выбарчыя лозунгі кандыдатаў Беларускага выбарчага камітэта. А прытым на якой мове маюць быць тыя лозунгі? Кірыліцай ці лацінкай? А як лацінкай, то па-беларуску, ці па-пудляшску? Напішам па-пудляшску, то бельскія ўкраінцы возьмуць іх, значыць лозунгі, за свае. Напішам па-беларуску, то палічаць нас пятай калонай Лукашэнкі. Напісаў я, што нашы лозунгі, па змесце, могуць быць прымітыўтымі ў параўнанні з іншымі лозунгамі. А па той прычыне, я так напісаў, што мы будзем дамагацца, каб у дзяржаўнай палітыцы большую ўвагу звярнуць на Усходнюю сцяну, якая адстае ў кожнай галіне. Ці то ў інвестыцыях, ці то ў гаспадарцы. Пусцеюць вёскі, а ў гарадах вялікае беспрацоўе. Так на добрую справу няма каму клапаціцца, каб рэгіён, дзе жывуць беларусы, развіваўся. Ваяводскую беластоцкую ўладу складаюць, апрача адзінак, палякі, якім лёс беларусаў, прынамсі, абыякавы. А ў найгоршым выпадку выслалі б нас усіх да Лукашэнкі. Такая ёсць праўда.

Міхась Куптэль

Турызм у Гарадоцкай гміне

Гарадок, распаложаны на абочыне Кнышынскай пушчы — з пачатку XVI да канца XIX стагоддзя горад — сёння мае ранг гміннай вёскі. У турыстычным плане Гарадоцкая гміна вылучаецца на фоне суседніх гмін сеткай маршрутаў і начлежнымі рэсурсамі; карыснае таксама невялікае аддаленне ад Беластока.

Няма затое мясцовых вырабаў і турыстычных прапаноў, сціплыя таксама гастранамічныя магчымасці. Не выносяцца і унікальныя культурныя каштоўнасці ў выглядзе своеасаблівых комплексаў вясковай забудовы. Гміна мае выдатныя ўмовы для развіцця агратурызму і розных форм актыўнага — пешага, веласіпеднага, байдарачнага, коннага — і спецыялізаванага — культурнага і прыродазнаўчага турызму.


Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Царква ў Каралёвым Мосце

Вялікім багаццем Гарадоцкай гміны з'яўляецца незвычайна разнастайны краявід. Большую частку ўзгорыстай гміннай тэрыторыі займаюць лясы Кнышынскай пушчы з Целічанскім і Хамутоўскім запаведнікамі на паўночна-заходняй акраіне гміны. Пушчанскія гушчары ды маляўнічыя, абрамленыя лесам даліны завіткаў рэк Супраслі, яе прытока Плоскай ды гранічнай Свіслачы з'яўляюцца найбольшымі краявіднымі каштоўнасцямі; па дзвюх першых рэчках пралягаюць байдарачныя маршруты. На поўдзень ад Гарадка распасціраюцца шырокія абшары тарфянікаў, балот і лугоў, з якіх набірае ваду рака Супрасль; там водзяцца водна-балотныя птушкі.

Да культурных каштоўнасцей гміны трэба залічыць прасторавую планіроўку Гарадка з трапецаідальным рынкам і царквою 1882-1889 гг., адбудаванай у 1946-1947 гг. пасля пажару ў 1942 годзе, касцёл, раннесярэднявечнае гарадзішча Замкавая гара. Многа цікавых запаведнікаў драўлянага будаўніцтва ў вёсках прылягаючых да гранічнай ракі Свіслач: Коматаўцы, Бабровнікі, Свіслачаны, Мастаўляны, цэрквы ў Мастаўлянах і Каралёвым Мосце, паслядворскі парк у Ярылаўцы, магілы паўстанцаў 1863 года ў глыбі Кнышынскай пушчы.

Праз Гарадоцкую гміну пралягае шэсць пешых маршрутаў:

— шлях Свята-Янскіх узгоркаў на адрэзку Жэдня — Каралёвы Мост — Супрасль;

— „Краем Кнышынскай пушчы" на адрэзку Саколле — Дзернякова — Гарадок — Страшава — Мастаўляны — Свіслачаны — Вераб'і;

— Напалеонаўскі шлях: Крынкі — Навасёлкі — Каралёвы Мост — Жэдня;

— „Па слядах Студзеньскага паўстання": Валілы-Станцыя — Ліпавы Мост;

— „Татарскі малы": Валілы-Станцыя — Крушыняны;

— шлях Міхалова — Валілы-Станцыя.

Тры веласіпедныя маршруты:

— Ялоўка — Бабровнікі — Крушыняны — Валілы-Станцыя — Каралёвы Мост;

— Гарадок — Радунін — Каралёвы Мост;

— Крушыняны — Гарадок — Радунін.

Ёсць два байдарачныя маршруты па Супраслі і Плоскай ды адзін маршрут конны.

У Гарадоцкай гміне пракладзены наступныя прыродна-адукацыйныя сцежкі: „Руда" (4 км), „Валілы" (7 км) і „Каралёвы Мост" (7 км). Іншыя цікавінкі гэта вадаём у Зарэчанах і назіральная вышка ў Пілатоўшчыне, у Бабровніках — пагранпераход у Беларусь. На тэрыторыі гміны працуе дзевяць агратурыстычных кватэр, у Валілах-Станцыі ёсць заезны дом, а ў Борках — гарцэрская база. Гастраномія засяроджваецца ў Гарадку, Валілах-Станцыі і Бабровніках.

Міхал Мінцэвіч

У Сямятычах

У апошнюю нядзелю мая ў Сямятычах адбыўся першы ў гэтым годзе канцэрт беларускай музыкі. Яго арганізатарам было БГКТ, якое паказала калектывы з Беласточчыны. Гасцінна выступіў таксама гурт з Пружан. Мастацкі ўзровень выканаўцаў быў даволі высокі, а пружанскія самадзейнікі вылучаліся прафесійным майстэрствам, так што прыемна было іх паслухаць. Шкада толькі, што так мала публікі сабралася ў сямятыцкім амфітэатры. Адной з прычын нізкай яўкі аматараў беларускай песні была невыносная жара, якая адпалохвала прыйсці ў амфітэатр і сесці на неаслоненых ад сонца лавачках. Мабыць, слухачоў было б больш, калі б не ранняя пара фэсту — 13 гадзіна, пачатак абедзеннай пары. І — традыцыйна — мерапрыемству не спадарожнічала адпаведная рэклама. Трохі плакатаў вісела ў Сямятычах, прагучала паведамленне па Беластоцкім радыё, але інфармацыя не дайшла да жыхароў падсямятыцкіх вёсак. Відаць, меў рацыю адзін з маіх суседзяў, які з горыччу заўважыў, што ўсе меншасныя таварыствы не забываюць наведваць вёскі толькі тады, калі патрэбны ім галасы выбаршчыкаў.

Некаторыя ўдзельнікі фэсту расчараваліся тым, што ў час канцэрту не прадаваліся аўдыёкасеты і выданні, хаця аб гэтым паведамлялася на плакатах.

* * *

У пятніцу, пасля Узнясення Гасподняга ў прыхадской Уваскрэсенскай царкве ў Сямятычах служыцца так званая „грамадня імша" за ўсіх жыхароў маёй вёскі Бацікі-Заднія. Гэта вельмі старая традыцыя, калісьці звязаная з абрадам асвячэння палёў і сядзіб. Сёння ад гэтага абраду засталося толькі набажэнства ў царкве, у час якога жыхары вёскі супольна моляцца за сябе, сваіх родных і тых, што разбрыліся па свеце.

Падобны звычай культывуецца таксама і ў іншых навакольных вёсках. Напрыклад, у суседніх Бацікі-Сярэдніх пасля літургіі ў царкве бацюшкі прыязджаюць у вёску і з малітвай адведваюць усе сядзібы. А пасля малітваў жыхары прымаюць сваіх душпастыраў урачыстым абедам у вясковай святліцы. Там, у больш свабоднай атмасферы, абодва бакі спакойна размаўляюць аб важных для прыхадской супольнасці справах і душпастырскіх праблемах вернікаў.

Гэты прыгожы абычай варты не толькі захавання для будучыні, але і пашырэння на іншыя вёскі.

М. Ц.

Тут мая прыстань

— На цяперашні лёс паўплывалі сустрэчы ў Пачаеўскім манастыры. Захаплялі мяне цудоўна размаляваныя іконы і разьбяныя ўпрыгожанні святыні. Запалі глыбока ў душу. Рашыў навучыцца гэтаму рамяству. Сам я выходжу з Дубна, што ў пяцідзесяці кіламетрах ад славутага Пачаева, — пачынае аповед **Мікалай РУДЫЙ-КЛІМОВІЧ**. — У дзяцінстве, пасвіўшы кароў, любіў стругаць розныя рэчы з дзерава. Неаднойчы пабываў у манастыры.

— Іван Лазарышын, 55-гадовы прафесіянал скульптар, меў заключаны дагавор на афармленне інтэр'ера ў новазбудаванай царкве ў Дабрывадзе. Ён пісаў іконы, а ягоны сын пазалочваў іх. Сын, аднак, часта пакідаў працу і выязджаў да жонкі. Аднаму Івану цяжка было справіцца з работай. Будучаму аднойчы ў водпуску скульптару, мая знаёмая рэкамендавала мяне яму ў памочнікі. „Усё патрапіць зрабіць", — запэўнівала.

Пазнаёміліся мы перад абедам, а на адвячорку падарожнічалі ўжо ў Польшчу. — Раней працаваў

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

я ў Чэхаславакіі і на работу ў Польшчу неахвотна хацеў ехаць. Калі сказалі, што праца тычыцца афармлення царквы, дык ідэя заработку здавалася быць здзяйсненнем маіх мараў.

— Калі Іван пісаў іконы, дык сын пазалочваў іканастас. Мне прызначылі падручныя работы ў сталярскай майстэрні. Затым шпакляваў я сцены і лакіраваў. Захапіўся так працай, што не прыкмеціў сімпатычнай суседкі, якая жыла побач маёй кватэры.

— З Марысяй сустрэліся мы выпадкова, — працягвае мой суразмоўца. — Гэта было ў навагодні вечар чатыры гады таму. У ліпені 2001 года мы згулялі вяселле.

Будучы ў Дабрывадзе, я вывучаў сакрэты разьбярскага майстэрства. Прывучыўся пазалочваць скульптуры. З Дабрывады пераехалі мы ў вёску Мора. Там рабілі іканастас. У 2003 годзе Іван захварэў. Мне прыйшлося выконваць абавязкі „брыгадзіра" і адказваць за сукупнасць скульптурнай працы. Самастойна зрабіў я кіоты для царквы ў Падбеллі і Кленіках. Шыкарна выглядаюць. Зараз патраплю вырэзваць і пазалочваць. У Дабрывадзе арганізаваў я майстэрню. Навакольны лес пастаўляе матэрыял. І цешыцца трэба, што з „нічога" можна зрабіць „штосьці".

Мікалай Рудый шыкарна абсталяваў жончын дом. Старадаўняя агароджа з „абалясаў" (галінак дрэў) лакіраваная, даўгавечная. Па старой модзе зрабіў ён куфар, выразаў ложак і камоду. А пры доме на стражы, быццам вартаўнік, стаіць вусаты казак з люлькай. Гэтая скульптура маніць сваім выглядам многіх цікаўных.

Уладзімір Сідарук

Папраўка

У допісе „Ці багатае Міхалова" М. Лук'янюка („Ніва" н-р 25 ад 19.06.2005 г.) была дапушчана намі памылка ў названні вёскі. Было напісана ў Агароднічках, павінна быць — **у Агароднікаx**.

У тэксце „Вера, Надзея і... Бельск" Я. Вапы („Ніва" н-р 26 ад 26.06.2005 г.) памылкова надрукаваная дата сустрэчы — павінна быць **10 чэрвеня**.

Чытачоў перапрашаем.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Тэатр жыве перш за ўсё дзякуючы дзецям і яны за сваю працу атрымалі класныя падарункі — беларускія кніжкі і кампакт-дыскі з беларускай музыкай...

Дом — тэатр без межаў

Як кожны год навучэнцы беларускай мовы сустрэліся ў Беластоку. У традыцыі горада, заведзенай настаўніцай Алінай Ваўранюк, ёсць прэзентацыя мастацкіх поспехаў яе выхаванцаў. Аднак у гэты раз мерапрыемства выпала надзвычай урачыста. Бацькоў і гасцей запрасілі ў дом культуры „Сподкі". „Дом — тэатр без межаў" — так называлася ўся прэзентацыя, якая адбылася 20 чэрвеня г.г.

Ад пераліку ўсіх поспехаў, якія заваявалі беластоцкія школьнікі і гімназісты, можа закружыцца ў галаве. Вось толькі найважнейшыя з іх. У гэтым годзе — тры лаўрэаты прадметнага конкурсу па беларускай мове для ПШ. Сталі імі Наталля Кандрацюк-Свярубская, Аляксандр Ваўранюк, Ганна Пякарская. Аж адзінаццаць лаўрэатаў цэнтральнага дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова". Самыя прэстыжныя ўзнагароды ўзялі Ніна Ваўранюк, Наталля Кандрацюк-Свярубская, Матвей Севастыянік (першыя месцы) і Наталля Швед (Гран-пры). Першае месца ў Праваслаўным конкурсе паэзіі заваявала Наталля Рудчык, якая выступіла з беларускім вершам Ніны Пінчук „Малюся табе, прасвятая".

Аднак самая вялікая колькасць прызоў прыпала ў Аглядзе тэатральных форм. Менавіта ў час сустрэчы бацькі і госці маглі пабачыць ды палюбавацца бліскучымі пастаноўкамі. Тут запрэзентаваліся гімназісты з пастаноўкамі „Смех не грэх" (прыдумалі спецыяльна пад юбілей Віктара Шведа) ды слоўна-музычны мантаж „Дом" (спецыяльная ўзнагарода). Паказаліся таксама наймалодшыя — дзеткі з пастаноўкай „Пампіллё" (другое месца) ды старэйшыя выхаванцы з пастаноўкай Людмілы Рублеўскай „Янук — рыцар мятлушкі" (першае месца).

— Мы ўдзячны спадарыні Аліне, — гаварыў узрушаны Янка Сегень, — бо яна наша асветніца як св. Еўфрасіння. Словы падзякі падмацаваў унушальны падарунак. Спецыяльна па заказу бацькоў была зробленая ікона св. Еўфрасініі Полацкай. Ікону выразаў у дрэве славуты Уладзімір Наумюк, народны разьбяр з Канюкоў. Гэта была таксама форма падзякі за экскурсію ў Полацк і сталіцу Беларусі, якую арганізавала настаўніца.

У сваю чаргу дзеткі атрымалі класныя падарункі — беларускія кніжкі і кампакт-дыскі з беларускай музыкай. Дзесяць выпускнікоў ПШ будуць працягваць навуку ў Гімназіі н-р 7. Варта адзначыць, што амаль усе яны атрымалі пасведчанні з чырвонай палоскай. Тут таксама быў дасягнуты рэкорд ПШ н-р 4, а ўстанавіла яго згаданая ўжо Наталля Кандрацюк-Свярубская (сярэдняя ацэнак 5,8). Калі ідзе пра наймалодшых — усе выпускнікі польска-беларускага прадшколля н-р 14 прыйдуць у першы клас, а на ўрокі беларускай мовы запісалася ўжо адзінаццаць асоб.

Палюбавацца беларускім тэатрам прыйшлі ўсе выхавацелькі беларускіх класаў і сам дырэктар ПШ н-р 4 Збігнеў Клімовіч. Прысутнічаў таксама консул РБ Вадзім Палякоў, які пажадаў поспехаў ды падорыў беларускія кніжкі. Ну і шырокая грамада паклоннікаў — апрача бацькоў, былі бабулі і дзядулі, сёстры і брацікі маладых акцёраў і дэкламатараў.

У час канікул нашы сябры сустрэнуцца на беларускіх летніках, якія разам з бацькамі арганізуе настаўніца Аліна Ваўранюк.

Зорка

Янка Сегень: Мы ўдзячны спадарыні Аліне, бо яна наша асветніца як св. Еўфрасіння...

Чаплі

Калі каля Семяноўкі разлілося вадасховішча, паявіліся птушкі вадалюбныя, якіх мы раней зачаста не бачылі. Такія, як **чапля шэрая**. Ды і цяпер цяжка яе ўбачыць зблізку, таму што вельмі яна асцярожная. Гэта птушка сям'і чаплевых, атрада буслападобных. Вядомая яна ў Еўразіі, Афрыцы і на Мадагаскары. У нас звычайны, месцамі шматлікі пералётны від. Чаплі шэрыя селяцца калоніямі ў поймах рэк, каля азёр, сажалак, вадасховішчаў. Кормяцца рыбай, насякомымі, жабамі на надрэчных лугах, на мелкаводдзі. Чапля ў велічыню бусла — даўжыня цела сягае 1 метра, маса 1,4-2,3 кг. Апярэнне спіны блакітна-шэрае, жывот, пярэдняя частка шыі і валляк слівава-белыя, лоб і цемя белыя. Над вокам шырокая цёмная паласа, якая на патыліцы пераходзіць у „касічкі". На ніжнім баку шыі тры паласы з падоўжаных чорных плям. Махавое пер'е чорнае. Дзюба жаўтавата-бурая, ногі зеленавата-шэрыя, радужына залаціста-жоўтая. Голас — кароткі пранізлівы крык „крранк". Гняздо чапля майструе на дрэвах, зрэдку ў трыснягу ў відзе рэдкага конуса. У калоніях бывае да 300 гнёзд. Яйкі чапля складвае ў маі, 4-5 зеленавата-блакітных, якія наседжваюць абое бацькі да 26 сутак. Чапляняты вылятаюць з гнязда амаль праз два месяцы. Адлятаюць у жніўні-верасні, зімуюць у краінах Міжземнамор'я, Афрыцы. Іншая **чапля — белая**, снежна-белая, вядомая ў Амерыцы, Паўднёвай Еўропе, Малой і Сярэдняй Азіі, Аўстраліі, у нас рэдкі пералётны від, занесены ў Чырвоную кнігу. Яна крыху драбнейшая за шэрую. У шлюбным уборы на патыліцы невялікі чубок, з нізу шыі пер'е звісае грывай. Ад ніжняй часткі спіны адыходзяць два пучкі рассуканых пер'яў-эгрэтак, якія закрываюць хвост. Ногі і шыя доўгія, дзюба простая, вострая, доўгая, чорная з жоўтай асновай, восенню і зімой жоўтая. Ногі — чырвона-бурыя. Вакол вачэй зеленавата-жоўтае голае кольца. Чапля белая не сядае на дрэвы. Голас грубы, хрыплы: „крранк". Гнёзды ўе ў трыснягу і чароце, зрэдку на нізкіх дрэвах. А **чапля белая малая**, чарнаногая — яшчэ меншая ад белай, выпадковы залётны від. Яна чыста-белая, з чубком стужкападобных пер'яў на патыліцы. Плечавое пер'е даходзіць аж да хваста. З-за гэтых элегантных пёраў-эгрэт не адна белая чапля наклала галавою...

Міра Лукша

Ільінская пятніца з Рыгі

Эвеліна Вышкоўская і Беата Клышко

Мой першы год у ліцэі

Я ўжо год вучуся ў ліцэі. З трыма гадамі ў гімназіі я правяла ў гэтай школе ажно чатыры гады. Якія яны былі? Цікавыя, карысныя, вясёлыя? Ці, магчыма, сумныя, непатрэбныя?

Жыццё чалавека гэта пасма розных здарэнняў, спатканняў і перажыванняў. Таксама жыццё вучня. Мы штодзённа праводзім у школе найменш па сем гадзін, а калі яшчэ вучань удзельнічае ў нейкіх кружках зацікаўленняў, дык сядзіць у школе па дзевяць-дзесяць гадзін. І так трэцяя частка жыцця ліцэіста гэта школа.

Мой першы год у ліцэі, хаця прыемны і патрэбны, быў і яшчэ будзе вельмі цяжкі, акуплены вялікімі намаганнямі, а не раз і стрэсам. Найбольш мне крыўдна, калі я спазіраю на свае ацэнкі... Быццам яны ненайгоршыя, але раней былі лепшыя і як тут не сумаваць? Кожны вучань хацеў бы быць лепшым. Але не так лёгка здабыць добрую ацэнку ў нашых патрабавальных настаўнікаў. Не адзін раз я сяджу над кніжкамі да поўначы або і даўжэй. А ў школе сон ціснецца на вочы, ніяк яго не адагнаць, але вучуся, хаця цяжка. А калі яшчэ настаўнік загадае расказаць тэму апошняга ўрока, дык тады чорная роспач. Вырвана амаль жа са сну не заўсёды ведаю, што навокал дзеецца...

Я люблю цішыню. Але дзе ж цішыня, калі такое прыгожае надвор'е і думкі зусім далёка ад школы. Цяпер раскажу штосьці вясёлага. Я вельмі люблю мой клас. У апошні час не магу нацешыцца цішынёй, але хачу падкрэсліць, што я заўсёды магу разлічваць на сваіх сяброў. Я хутка пасябравала з дзяўчатамі, мы можам свабодна пагутарыць аб сваіх праблемах, а таксама спаткацца пасля ўрокаў і разам праводзіць час. А хлопцы з І „а" класа — гэта вельмі сімпатычныя маладыя людзі. Я магу з імі пасмяяцца, пажартаваць, а як часам пазлуем на сябе, то злосць хутка знікае.

Нашы настаўнікі добра нас трактуюць у ліцэі. Яны стараюцца зразумець маладога чалавека, і, як толькі ўмеюць, памагаюць нам калі маем праблемы.

Так выглядае мой першы год навукі ў Гайнаўскім белліцэі. Хаця цяжкі, але вельмі прыемны і патрэбны. Мне марыцца, каб наступныя два гады, якія яшчэ перада мной, не былі горшымі ад першага. Каб атмасфера і людзі былі такімі, як сёння...

Магдаліна Андраюк, І „а" кл.

PS. Прывітанні рэдакцыі „Нівы".

Вершы Віктара Шведа

Малако паплыло раўчуком

Мама сварыць свайго сыночка:
— Абяцаў ты мне глядзець,
Скіраваць на гэта вочкі,
Калі будзе малако кіпець.

— Я, матуля, сачыў безупынна
За каструляю з малаком.
Была восьмая роўна гадзіна —
Малако паплыло раўчуком.

Дасканалы парашок

Не нахваліцца матуля —
Дасканалы парашок!
Надта белая кашуля
Сталася цяпер, сынок.

З той ацэнкай не згадзіўся
Анічуць сынок Яўген,
Бо з кашулі цалкам змыўся
Надпіс дарагі „Спартсмен".

Польска-беларуская крыжаванка № 27

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 23: Яр, агляд, свет, тэатр, смак, традыцыя, ар, экран, ігра, акцёр. СМІ, паэт, гара, алтар, ярд, яд, сцэна, смык, ваяр, век, турнір.

Узнагароду, кніжку Юркі Геніюша „З маёй званіцы", выйгралі: **Наталля Янцэвіч, Анна Анікюк, Эвеліна Ігнацюк, Паўліна Башун, Дыяна Капытка** з Чыжоў, **Іаанна Леанеўская, Анна Савіцкая, Караліна Янюк, Юліта Скепка, Якуб Сухадола** з Нараўкі. Віншуем!



З абодвух бакоў мяжы

Ад 2003 года вучні і настаўнікі Гімназіі і Падставовай школы ў Дубінах супрацоўнічаюць са школай у Пружанах. Нядаўна выязджалі яны да сяброў у Беларусь, пабывалі ў Брэсце і наваколлі. Пасля прыезду дамоў вучні наладзілі ў школе фотавыстаўку, на якой адлюстраваны кантакты моладзі абедзвюх школ. Вучні з Дубін падрыхтаваныя да рабочага супрацоўніцтва, у час якога намерваюцца збіраць інфармацыю пра даваенныя кантакты жыхароў Гайнаўшчыны і Пружаншчыны, якіх раздзяліла дзяржаўная мяжа.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Выпускнікі дубінскай гімназіі рады, што маглі выязджаць у Беларусь (ззаду Кацярына Філіпік і Юліта Анхім)

Супрацоўніцтва з Беларуссю

— Ужо раней вучні з Пружан расказвалі нам, што іх дзядулі прыязджалі перад вайной у Гайнаўку. Жыхары нашых мясцовасцей таксама ездзілі ў наваколле Пружан. Добра было б запісаць гэтыя ўспаміны, — кажа дырэктар Гімназіі ў Дубінах Тамара Крайнік. — 31 сакавіка гэтага года ў нашай школе адбылася чарговая сустрэча з гасцямі з Беларусі, у час якой былі праведзены рабочыя варштаты. Моладзь вучылася знаёміцца і адкрывацца на іншых людзей. Такія ўмеласці патрэбныя для лепшага супрацоўніцтва паміж нашымі вучнямі. У пружанскай школе найчасцей прапануюць нам паглядзець мастацкія дасягненні вучняў, якія многа часу праводзяць на пазаўрочных заняткох і займаюцца ў доме культуры.

Вучням з Дубін спадабаліся заняткі праведзеныя з моладдзю з Беларусі і апошняя экскурсія ў Пружаны, якая адбылася з 19 па 20 мая гэтага года. Дзеткам і моладзі з дубінскай школы паказалі Брэсцкую крэпасць і цікавейшыя месцы ў Брэсце. У Ружанах вучні пазнаёміліся з руінамі замка Сапегаў, а ў Магілёўцах наведалі мясцовы музей. З нагоды святкавання шасцідзесяцігоддзя з дня заканчэння Другой сусветнай вайны моладзі паказалі мясцовыя месцы нацыянальнай памяці.

— Спадабаўся нам Брэст і яго наваколле. Моцна пасябравалі мы з вучнямі з Пружан. Абмяняліся мы адрасамі і будзем перапісвацца, — гаворыць Кацярына Філіпік з Гімназіі ў Дубінах.

— Многа гаварылі мы пра вучобу. Бачым, што сістэма навучання і праграмы ў Беларусі крыху розняцца ад нашых, — заяўляе Юліта Анхім. — Мы хацелі б яшчэ раз паехаць у Беларусь і спаткацца з нашымі сябрамі.

— Жылі мы ў дамах сваіх сябраў і мелі нагоду паразмаўляць пра іх штодзённае жыццё. Заўважылі мы, што жыццё ў Беларусі падобнае да нашага і ў моладзі зацікаўленні такія, як і ў нас, — дабаўляе Павел Герасімюк.

Дубінскія і пружанскія вучні пачалі сябраваць у студзені 2003 года. Моладзь з Беларусі шукала на Гайнаўшчыне партнёра і на іх прапанову адгукнулася школа ў Дубінах. Зараз у Дубінах рады, што наладзілі кантакты са школай з-за мяжы.

— Нашы вучні маюць нагоду пазнаёміцца са сваімі равеснікамі з Беларусі і больш даведацца пра жыццё ў суседняй дзяржаве. Моладзь можа многа ўбачыць у час экскурсій па наваколлі Пружан. Яднае нас адна культура і геаграфічныя ўмовы жыцця, а раздзяляе толькі мяжа. Зараз мы хочам, каб малодшыя вучні нашай Падставовай школы пазнаёміліся з равеснікамі ў Беларусі. Будзе гэта даваць магчымасць даўжэйшага супрацоўніцтва паміж нашай моладдзю, — кажа Тамара Крайнік.

— Нашы дзеткі ў магазінах часта карысталіся дыялектнай беларускай мовай і заўважылі, што наша гаворка прыдатная ў міждзяржаўных кантактах. Вучні заўважылі, што ў многіх выпадках жыццё ў Беларусі разыходзіцца з інфармацыяй аб Беларусі, якая агучваецца ў польскіх масмедыях, — гаворыць настаўніца беларускай мовы Ніна Куптэль. — У школе і сем'ях, якія нас прымалі, сустракаліся мы з добрай атмасферай і вялікай гасціннасцю.

— Выезды нашых вучняў у Беларусь заахвочваюць нашу моладзь запісвацца на заняткі роднай мовы, — дабаўляе настаўніца беларускай мовы Валянціна Касцевіч.

Вучацца і адпачываюць

Моладзь са школы ў Дубінах любіць збіраць гістарычныя звесткі з мінулага. Апошнім часам на заняткох беларускай мовы вучні пісалі расказы пра ваенныя дзеянні ў іх вёсках. Карысталіся яны аповедамі сваіх бабуляў і дзядоў.

— Вучні любяць актыўную працу. Раней у рамках заняткаў беларускай мовы збіралі яны расказы пра народныя традыцыі ў іх вёсках, — кажа настаўніца Валянціна Касцевіч.

Вучні і настаўнікі Падставовай школы і Гімназіі ў Дубінах 4 чэрвеня наладзілі сямейны фэст, на які запрасілі бацькоў і сямейнікаў. На мерапрыемства пад адкрытым небам прыбыло многа людзей.

— Наш фэст наладзілі мы ў рамках змагання з модай на спажыванне алкаголю. Цэлы год нашы вучні выконвалі антыалкагольныя плакаты, якія ўпрыгожвалі наша мерапрыемства, — кажа дырэктар Тамара Крайнік.

Вучні выступілі перад сваімі бацькамі з мастацкімі мантажамі. Дзеткі і бацькі маглі прыняць удзел у латарэі і атрымаць падарункі. Моладзь прапагандавала здаровы спосаб жыцця і прапанавала спажываць стравы з агародніны і фруктаў.

— У нашай школе сімпатычныя настаўнікі і добрыя ўмовы вучобы. Можам займацца ў дзвюх камп'ютэрных залах. Шкада толькі, што няма яшчэ спартыўнай залы, — заяўляюць выпускніцы Гімназіі Кацярына Філіпік і Юліта Анхім, якія будуць паступаць у Гайнаўскі белліцэй. — Беларускі ліцэй у Гайнаўцы, гэта цудоўная і прэстыжная школа. Ёсць там добрыя ўмовы для вучобы. Аднак зараз мы не ведаем, ці будзем туды прыняты.

Аляксей Мароз

Фота АДАМА КОТА

Вучні дубінскай школы ў час апошняй экскурсіі наведалі Брэст

Паваяваў

Успаміны Сцяпана ВЯЗОЎСКАГА, народжанага ў 1922 годзе ў Зубаве.

У школу ў Зубаве хадзіў я чатыры гады. Пасля кароў пасвіў, з паўсяла; давалі мне булкі і хлеб. Як падрос, рабіў у аднаго гаспадара; там мяне бульбай і таўканіцай кармілі. Аднойчы гаспадарова жонка нарабіла мне пампушак, а гаспадар іх ад мяне забраў.

Калі наступалі немцы, я крыж з хаты занёс на вярбу, каб не згарэў разам з хатай; яшчэ той крыж захоўваю.

Калі насталі немцы, я рабіў у солтыса. Пасля вызначылі мяне на работу ў Германію, бо наша сям'я вялікая была; у мяне было яшчэ траіх братоў і не было з чаго жыць.

У бельскім арбайтсамце трымалі нас суткі, а пасля завезлі ў Кёнігсберг. Пераначавалі і немец спытаў, ці я ўмею фурманкаю ездзіць; я адказаў, што не. „Будзеш на такарні рабіць", — сказаў ён мне.

Працаваў я па дзесяць гадзін у суткі. Спалі ў бараку, на нарах: па дзве нары ўпоравень знізу і дзве такія ж уверсе. Са мною працаваў 70-гадовы немец. Ён гаварыў мне, што Гітлер непатрэбна пайшоў вайною на Расію, бо не возьме яе; ён у першую вайну быў у царскім палоне і гаварыў мне, што ў рускіх добра было. Калі да станка набліжаўся вахман, ён мяне асцерагаў „Штэфан, арбайт!"

Прывучаў мяне да работы фольксдойч у жоўтым, паказваў рукамі як рабіць формы для снарадаў на машыне. „Як папсуеш, — гаварыў — то павесім". А калі ён праходзіў і нешта не ў парадку было, бо не было ў яго ні старога, ні малога — кожнага біў.

Ад азоту цяжка было адмыцца, трэба было ў лазню хадзіць. Як хто брудны быў, таго штрафавалі па дзве маркі. Калі фронт быў блізка, усіх пагналі 9-метровыя акопы вакол горада капаць. Як былі баі, загарэлася ад бочкі цэлая фабрыка.

Рускія, наступаючы, пазрэзвалі альшыну, па бярвеннях прайшлі выкапаныя намі акопы і ўварваліся ў горад. Адна немка ўцякала і рускі танк раз'ехаў яе гусеніцамі.

Раней наш загадчык пытаў, ці аддамо яго каб рускія забілі. Мы адказвалі, што не. Уварваліся рускія:

— Где заведующий? Убить его!

І мы папрасілі, каб яго не біць. А ён быў раней, калі хто пасылку з дому атрымаў, глядзеў, ці не было там гарэлкі. Даваў тады кілішак і казаў выпіць. І пытаў:

— Як?

— Штарк! (Моцная!)

Тады ён тую гарэлку забіраў сабе.

Калі рускія дапытвалі пра нацыянальнасць, я назваў сябе беларусам. Апранулі мяне ў шынель, далі ружжо і сказалі:

— Служил немцу, теперь нам будешь служить!

І пагналі на фронт. А палякаў бралі ў польскае войска. Кінулі нас эшалонам на Гданьск. Мы трапілі пад абстрэл з мора, а нашы „Кацюшамі" па іх. Хацелі нас яшчэ ў Японію выслаць, але той выезд адклікалі.

Нашу часць перавялі ў Херсон, каля Крыма, у казармы. Мяне паставілі варыць для ўзвода. Пасля месяца пагналі ўсіх на вагу, а яна добра пацягнула. Тады і мне лепш стала, афіцэрам стаў варыць. Адзін генерал, у якога дзве дачкі было, гаварыў мне:

— Стефан, возьмешь дочь, так вот как жить будешь!

А іншы афіцэр гаварыў мне:

— Знаешь, какая в нашем государстве тайна?

— Язык надо держать, — адказваю.

— Вот так!

Праслужыў я ў Херсоне мо з два гады. Праз Львоў вярнуўся ў Польшчу, на сваю гаспадарку.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Беластоцкія пульпэты

Гэтым разам не буду пісаць аб жыцці студэнта ў Торуні, але аб жыцці беластоцкага студэнта. Маю на думцы маю духоўна-інтэлектуальную частку, бо людзі гавораць, што не адчуваюць, што я адсюль („A dlaczego nie zaciągasz jak u was?”).

Мой акцэнт можа і не беластоцкі, але душа — беластоцкая, да болю, а беластоцкая літаратура ці мастацтва мне зусім не чужыя. Не кажу пра ўсім вядомага Эдварда Рэдлінскага або паэта Веслава Казанэцкага. Ці нават пра Кацярыну Еву Здановіч, якая — як і я — з Крупнік.

З беластоцкім мастацкім часопісам „Карткі” асацыюцца некаторыя прозвішчы. Не хачу ў даны момант называць усіх пісьменнікаў, але прыпомню асобу, якую ведаю як экс-журналіста рэгіянальнага тэлебачання. Гэта Войцех Каранкевіч. Ён, між іншым, ініцыятар легендарнага гурту „Grópa obłęd”, аўтар фільма „Фіктыўныя пульпэты”, штотыднёвых фельетонаў у „Кур’еры паранным”, спектакля „Эмацыянальны стрыптыз — Секс на чамаданах” (можна было яго пабачыць у кафэ „Кабарэт”), вядучы тэлепраграмы „Дайджэст асаблівасцей”. Ён ездзіў па вёсках і распытваў жыхароў чаму — паводле іх — вёска так а так называецца. Насамрэч, бывалі вельмі цікавыя адказы, а тэлегледачы маглі пазнаёміцца з мудрасцю „люду”...

Апошнім часам Каранкевіч з сябрамі змагаецца за дрэвы ля Рынку Касцюшкі ў Беластоку. Пакуль яны растуць, але „дзякуючы” ўладам і галоўнаму архітэктару горада яны могуць пайсці пад тапор. Каранкевіч збірае подпісы пад петыцыяй з патрабаваннем захаваць гэтыя дрэвы, якія — як ні глядзець — даюць прыемны цень улетку, ахоўваюць ад ветру ўзімку, а перад усім — састаўляюць частку натуры ў сэрцы горада.

Міфалагізаваныя асобы ўмеюць у адной хвіліне знікнуць, стаць нармальнымі, звычайнымі...

Люблю вуліцу Суражскую. Калі іду ў малочны бар „Падлясяк” Каранкевіч мінае мяне на веласіпедзе, у джынсах і пінжаку, а ў бары сустракаю прадаўцоў з кнігарні „Акцэнт”, найбольш адухоўленую з вядомых мне кнігарняў. Іду далей і заўважаю, што побач галерэі „Маршанд” сядзіць Багдан Дудко, часам Мікола Ваўранюк ды іншыя журналісты. Нейкая беластоцкая паштоўка. Жывая паштоўка. На маёй былі б менавіта гэтыя вобразы і разам з імі баяніст-спявак выконваючы „Белыя розы” або іншыя песні вядомыя як палякам, так і беларусам. Люблю таксама старыя часткі вуліцы Варшаўскай, шпацыру па якіх я не замяніла б на нішто іншае.

У мяне з Каранкевічам былі тры неспадзяваныя „сустрэчы”. „Сустрэчы”, бо ніколі я з ім не гаварыла — і хіба не хацела б, бо ведаю як міфалагізаваныя асобы ўмеюць у адной хвіліне знікнуць, стаць нармальнымі, звычайнымі.

Першая сустрэча — у часопісе „Лямпа” (www.lampa.art.pl), якая піша пра альтэрнатыўнае мастацтва. Станоўчая неспадзяванка — Каранкевіч у часопісе Паўла Дуніна-Вансовіча.

Другая, калі сяброўка сказала мне пра музычна-літаратурны фестываль „Свабодны Горад Гданьск”, у час якога выступалі самыя лепшыя артысты Польшчы (паэты Тамаш Дамброўскі, Марцін Цэцка, а з Беластока, між іншым, гурт „Спэйс Брадэрс” ды Мар’юш Касьянюк). Сярод іх быў і Войцех Каранкевіч.

Трэцяя — сёння. „У суботу, нядзельку...” часам гляджу па тэлевізары. Сёння субота, дык, думаю, уключу тэлевізар, можа нешта цікавага пакажуць.

Новы тэлеканал „Pl”, які прэзентуе польскія, забытыя наогул, мастацкія і дакументальныя фільмы, вядзе цыкл „КінОФФтэка. Слоўнік паэтаў польскіх” („KinOFFteka. Poczet poetów polskich”). Каранкевіч кажа, што дастаў стыпендыю міністра культуры, купіў камеру і задумаў рабіць кароткаметражныя фільмы. Але гэта не ўсё, бо тое, што нязвыклае ў польскай рэчаіснасці гэта — паэзія. Хто сёння яе чытае? Ці нас (нас?) многа? Ці гэта патрэбнае? Гэта акажацца.

Форма праграмы цікавая. Аўтар сустракаецца з літаратарамі (кс. Ян Твардоўскі), яны чытаюць свой верш або і не (Дарота Маслоўская), дэкламуюць пад музыку (Марцін Цэцка), паказваюць важныя для сябе месцы (Марцін Святліцкі). Гэтыя сустрэчы кароткія, але ж складаецца ўражанне, што такія быць павінны. Яны ў сам раз.

Характэрны Каранкевічу гумар праяўляецца, калі пытае аўтара, чаму ў ягоным вершы напісана што „цяля не ходзіць узімку па снезе”. Аўтар адказаў, што сам ён не ведае. Гэта, здаецца, небяспечнае. Пасля таго Каранкевіч пытае селяніна, а праз хвіліначку яны абодва выпускаюць цяля на снег. І што? Ну а як, яно ходзіць!

Мой сусед падараваў мне калісь кніжку пра легенды Беласточчыны і аказалася, што яе напісаў бацька Войцеха — Януш Каранкевіч. Ён моцна звязаны са сваёй вёскай Дзікае, што пад Харошчай, і ваколіцай. Гэта дапамагае зразумець карані сувязі Войцеха з рэгіёнам. Але гэта толькі цікавінка, бо самая важная асоба гэта Каранкевіч-малодшы.

Сапраўды, шкада што Каранкевіча мушу (але ж і хачу!) глядзець аж у Торуні, у тэлебачанні, ці (тэарэтычна) у Гданьску. У мяне складваецца ўражанне, што на беластоцкім панадворку ён незаўважаны, хаця і прысутны шмат гадоў. Ці гэта праўда? Маю надзею, што памыляюся. Можа гэта не важнае, бо хацела толькі нагадаць пра ягоную асобу. Каб чытачы звярнулі ўвагу на тое што ён прэзентуе. Варта.

Анна Лушынская (Лімонка)

Думкі на палях артыкула Міколы Ваўранюка „Ніколі не ўзыдзе сонца”

Чому кідаешся на нас з кіптюрамі?

Ідзе змаганне за двухмоўныя табліцы ў „беларускіх” гмінах Падляшскага ваяводства. Гэта змаганне за захаванне арыгінальнасці нашай тоеснасці. Гэта частка працэсу выпрацавання сучаснай беларускай нацыі, якая здолее перапрываць у Польшчы, будзе ганарыцца сабою і выклікаць пашану ў іншых. Таму, будучы меншасцю, нельга адчуваць сябе горшымі, закамплексаванымі, крывадушнымі ды ілжывымі. На жаль, гэтак часта паводзяць сябе беларусы, прыкладам чаго артыкул Міколы Ваўранюка „Ніколі не ўзыдзе сонца”, які закранае праблему акцыі „Ja żyvu u Polščy”. Гэта тэкст беларускага журналіста, які павінен старацца добра выконваць сваю працу — пісаць праўду. А што робіць (і цікава чаму)?

„Дайсці да тых, хто прыдумаў і расклейваў плакаты не было цяжка”. А што тут цяжкага, калі плакаты падпісаны — BASVAS CREW, чаго вопытны Шэрлак Холмс, як сябе называе Мікола Ваўранюк, не пабачыў („арганізатары акцыі хочуць застацца ананімнымі”). Усім, хто сутыкаецца з сучасным беларускім студэнцкім рухам у Польшчы, гэты назоў наводзіць на думку варшаўскае згуртаванне БАСу. Мабыць, спадар Ваўранюк як журналіст такімі справамі не цікавіцца. Тады запрашаем на інтэрнэт-старонку. Тут дастаткова аднаго тэлефона, а не двух, або кантакт па э-майлу. Няма чаго ганарыцца хуткасцю! Тым больш, што мы зусім не хаваліся. А пасля двух тыдняў, калі Ты звярнуўся да нас са сваёй несур’ёзнай прапановай, амаль што і паспелі пра сваю акцыю забыць. Ці Ты уяўляў сабе, што прыедзем у Гайнаўку або Бельск і будзем перад камераю гуляць у беларускую моладзь? Wolne żarty!

„Каб акцыя не засталася бясследнай, запрапанаваў я яе ініцыятару, што пакажу гэта ў тэлебачанні”. Дівна для журналісты нэфаховусьць — хваціло б вуйті на сторонку BASVAS-у, коб дознатісь, што нэ было одного ініцятара, а думка зроділась соборно. До рэчы — росказвалі Тобе про сёе ў час тэлефонічного розговору. Да таго — рэдактар — Ты не Атляс і не тройца чарапахаў, якіе падтрымоўваюць ўвесь беларускі сьвет на сваіх горбах. Прачніся — мабыць німа чаго ўжо трымаць, а тым болей хваліцца гэтым. Мо Твой крыж і цяжар проста не існуе, гэта толькі Твая выдумка, simulacrum, бурбалка. Беларускасьць, якая жыве толькі й выключна дзеля перадачаў, фэстынаў ды іншых басовішчаў — гэта нікому не патрэбная мана. І тут бачыш, як тонка мэжа поміж уяўленьнем сэбэ як дэмюрга а..., як говорат на вёсьці, не-дэмюрга. Білоруськосьць будэ існоваці й без Твоей, pozal się Boże, рэдакторской ласкі.

„Бо, гэта ніякі голас у дыскусіі над двухмоўем, а проста акцыя дзеля акцыі групкі сяброў. Нічога гэтым яны не хацелі сказаць.” Колі плякат „Ja żyvu u Polščy” нічого для Тэбэ нэ значыт у пудляськум контэкстові, тогды прожываеш у іншум свіэті чым іншы людэ на Пудляшы або, прошу Тэбэ, в Білостоці. По праўдзі — не йшло нам про двухмоўе. Не знаходзім сэбэ в Твоюом говореню, Твоюой мэнтальносьці. Або інакш кажучы — Ты нам нэ спуолка — „не па дарозе з Вамі нам”. Але нэ будэм муоцно плакаці чэрэз тое. Творым собе іншу білорускосьць, бо в такуой якую Ты прэзэнтуеш можна задушыцісь. Няхай беларускасьць, такая наша мара, вызваліцца ад прыгнёту аднагалосься родам з савецкіх часоў. Твая праўда адзіная, у нас іх шмат і не называем іх вялікімі літарамі. Мо таму, што ні нам за гэта плоцяць, але мы кідаем у гэта свае грашакі. Для нас ідэя — не двухмоўе, але шматмоўе, гэтэраглёсыя. Але няхай Табе! У гэтым праекце знойдзецца месца так сама й на Тваю беларускасьць.

„Ну і байцы! Наша будучыня, якой свет да ног сцелецца!” Хіба адзіны момант у якім Ты ні схлусіў. Свое вжэ зробілі, й далізй робім, і будэмо робіті! Урраа!!!

„Дзетачкі, мае даражэнькія, усё, чаго захочаце, будзе вам дадзенае, адно глыбей капайце вашы норы!” Добрэ, што нэ назвав нас унукамі! Нэ пудобаецьця — зробі свою акцыю. Мы нэ працюем як дізайнэры й „клейітельнікі” плякатов, однак тое робім. Сам тое вчынь, Ты шчэ нэ за старый — от Тобіэ і наша порада. Робім свою справу по тіху й по малу. Аліэ пу пэршэ — нэ значыт, што нэ открыто й нэ на пувыэрхні. Відно пу эфэктах. Пу другое — (тут нічого нэ выдумалі). Пу трэте — мы Тобіэ нэ шкодім, то чому кідаешся на нас з кіптюрамі? Увособляеш часту сэрэд біэлорусов рысу, котору нэнавідім — як хтось нэ скачэ як я на дудці граю й нэ п’е зо мною горыэлкі, авжэж опецькаю ёго як ворога й стопчу. Можеш поганіті тое, што робім, як пацук збуожэ й рыті свое ямкі, мы ў іх нэ впадэм і нам нэ зашкодіт. О!

Навэть про пувдньуового сусіэда Польшчы напісав неправду. У Словаччыні е двухмовны табліцы, ласьне тому што мэншосьті складают одну пяту насэльніцьтва й змагаліс за іх, а нэ тому што словакі такі добры і толэрантны, што знае кожны, хто оно чуть-чуть затікавівся словацькуй мэншосьцювуй політыкою... Дівісь пучаток — трэба быті жэтэльным і знатісь про тое што пішэць, коб ніхто нэ закінуов белорусом, што воны тыэмны. Мы на прыклад нэ пішэмо про мэншості в Канаді, бо нічого на сёй тэмат нэ знаем.

Ня крыўдуй за нашае „per ty”, але так гаворым да жулікаў, зь якімі спалучае цябе спосаб канструаваньня высказваньня. Багацьцё й разнастайнасьць матаў, якую мы пачулі падчас размовы з Табой, параўнаць можна толькі да дыскурсу спад ГэСу ў Тыневічах. Мы знаем культуратворчу вартасьць мата — і так, яна вяліка. Толькі як заўсёды, патрэбна сьціпласьць — тым больш, што цягнеш на сябе ярмо рэ-культывацыі Беларускай Культуры.

Од імені BASVAS CREW

Паўлюк Бушко, Ігарук Іванюк, Збышук Місюк, Войтук Сегень, Тамашук Суліма

PS: Яшчэ адна заўвага пра шматмоўе — гледзячы на штораз бунейшы турыстычны рух у нашай малой айчыне, варта вучыцца й англійскай мовы — „Designed by” абазначае „створана праз”. А „Dubrus” гэта псэўданім мастачкі, якая размалявала нашу плякатку. Няхай дружба й любоў запануе на нашай шматпакутнай падляшскай зямельцы.

Ад рэдакцыі: Пісьменнасць тэксту захаваная. Загаловак ад нас — быў: „Рознагалоссе — адказ ад «Poster Pasters»”.

ЗГУРТАВАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ

www.nobility.by

Кажуць, што беларусы — нацыя сялянская. З большага гэта, зразумела, так. Яшчэ з часоў павольнага заняпаду Вялікага княства Літоўскага — старажытнай беларускай дзяржавы — тыя, хто меў нейкую ўладу і імя (у высакародным значэнні гэтага слова) імкнуліся захаваць усё гэта праз адмаўленне ад сваіх каранёў і слаўнай гісторыі продкаў.

У наш час прыналежнасць да колішніх знатных радоў дае хіба толькі нейкі гонар, не больш таго. Але калі аналізаваць гэтае своеасаблівае адраджэнне радавой памяці ў нашчадкаў шляхты, з прыемнасцю можна адзначыць, што цяпер ужо акцэнты змешчаныя ў адпаведным накірунку. Нашчадкі былой шляхты называюць сябе шляхтай менавіта беларускай. Сведчаннем чаму можна назваць сайт у Інтэрнэце http://www.nobility.by. Дарэчы, ён так і называецца — Згуртаванне беларускай шляхты.

Калі мы набярэм на камп'ютэры вышэйпададзены адрас, то перад намі адкрыецца простае, але цікавае выяўленне бел-чырвона-белага шчыта з шасціканцовым крыжам пасярэдзіне і каронай наверсе. Над і пад гербам па-беларуску і па-англійску назва сайта. Каб увайсці да сайта трэба клікнуць на надпіс на беларускай мове. Тады перад намі адкрываецца строгая, але насычаная інфармацыяй старонка.

Першая старонка падзелена на дзве часткі. Левая, найшырэйшая, змяшчае кароткія анатацыі і выйсці да розных дакументаў, што тычацца дзейнасці Згуртавання беларускай шляхты, а таксама апошнія важныя для арганізацыі падзеі. Правая частка выдзеленая шэрым фонам у нечым дублюе інфармацыю з яе, але тым не менш, змяшчае выйсці да некаторых іншых рубрык.

Пачнем з галоўнага, што ёсць у кожнай арганізацыі, са статута. Менавіта тут мы можам даведацца, чаго ж непасрэдна хочуць нашчадкі былых князёў і графаў. Як сведчыць статут, іх мэта — „аб'яднаньне і згуртаваньне асобаў шляхецкага стану на падставе агульных інтарэсаў; усебаковае вывучэньне, зберажэньне, адраджэньне і разьвіццё беларускай нацыянальнай духоўнай і матэрыяльнай культуры; выяўленьне слаўных старонак агульнай і вайсковай гісторыі Беларусі, высьвятленьне ўкладу беларускай шляхты ў гісторыю дзяржавы". Так што мэты цяперашніх шляхцічаў самыя прабеларускія, што з прыемнасцю можна канстатаваць.

Левы бок першай старонкі месціць таксама выйсці да пераліку зарэгістраваных у арганізацыі шляхецкіх радоў, энцыклапедычныя даведкі пра тыя ці іншыя званні высакародных саслоўяў, паведамленне аб прыняцці ў набілітаваныя рады.

Правая частка дае магчымасць „прайсціся" па рубрыках сайта. У „Гісторыі" мы можам даведацца, якім чынам і калі паўстала Згуртаванне. „Сяброўства" распавядае пра ўмовы ўступлення ў арганізацыю, „Кіраўніцтва" пералічвае знатных асобаў, што ўзначальваюць беларускі набілітэт.

Калі падагульняць уражанні ад наведання сайта, адчуваеш нейкі дзіўны смутна-абнадзейваючы прысмак. Так, сёння нашчадкі былых баронаў і герцагаў не маюць тых паўнамоцтваў, што мелі іх прапрадзеды. І яны самі гэта добра разумеюць — перад сваімі прозвішчамі з іх амаль ніхто не ставіць тытулаў кшталту „князь", „герцаг", „барон" і гэтак далей, нават пан ці спадар не знойдзеш. Але прыемна, што людзі імкнуцца да сваіх вытокаў, шануюць уласную гісторыю, якую непарыўна звязваюць з гісторыяй цэлай Беларусі.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускія жанчыны выступалі ў першай лізе і ў выніку саступілі толькі брытанкам, адстаўшы ад іх на 34 ачкі...

Беларусь, беларусы...

Стаўка на маладых

У мінулым нумары мы паведамлялі пра ўдзел беларускіх лёгкаатлетаў у Кубку Еўропы. Зараз падрабязней пра гэтыя спаборніцтвы і нашых прадстаўнікоў на іх. Кубак Еўропы — сама камандавы турнір. На многіх чэмпіянатах афіцыйна і неафіцыйна падлічваюцца медалі і ачкі, якія дазваляюць класіфікаваць краіны. На Кубку кантынента сістэма вельмі простая. Ад кожнай дзяржавы ў кожным відзе „каралевы спорту" выступае толькі па аднаму прадстаўніку. Паводле яго месца налічваюцца пункты, такім чынам ад кожнага наўпрост залежыць агульнае камандавае месца.

Беларускія жанчыны выступалі ў першай лізе і ў выніку саступілі толькі брытанкам, адстаўшы ад іх на 34 ачкі. Што ж, Вялікабрытанія трапіла ў Суперлігу, а ў нас ёсць рэальныя шанцы зрабіць гэта ў наступным сезоне. Што ж датычыць персаналій, то варта адзначыць чэмпіёнку краіны бягунку Вольгу Краўцову з Гродзеншчыны. Яна выйграла стаерскую дыстанцыю 5 000 метраў, усталяваўшы асабісты рэкорд і апярэдзіўшы чэмпіёнку свету з Англіі Полу Рэдкліф. Сур'ёзную канкурэнцыю брытанцы склала і дасведчаная Алеся Турава ў бегу на 3 кіламетры — наша спартоўка ў выніку стала другой. Як і чакалася, беларускі перамаглі ў эстафеце 4 па 100 м. Пераканаўча выступіла ў трайным скачку спрактыкаваная Наталля Сафронава з Брэстчыны (у звычайных скачках яна заняла трэцяе месца). Значны ўклад зрабіла Алена Неўмяржыцкая, якая была другой на дзвюх спрынтэрскіх дыстанцыях. Што датычыць нашых каронных відаў, то ў штурханні ядра маладая Тацяна Ільюшчанка, чэмпіёнка Беларусі з Віцебшчыны, заняла другое месца. Заўважым, што не выступала наша лідэрка Наталля Харанека, якая трывала ўваходзіць у эліту. А алімпійская чэмпіёнка Яніна Карольчык даўно не трэніруецца, зусім нядаўна яна нарадзіла дзіця. Яшчэ адна наша прыма Эліна Зверава выступала пасля траўмы і ў кіданні дыску паказала другі вынік. А ў цэлым трэнеры слушна зрабілі стаўку на маладых. Праблемнымі відамі ў нашай жаночай дружыны ёсць скачкі з шастом, у вышыню і кіданне дзіды.

Нашы лёгкаатлеты выканалі заданне, перамогшы ў другой лізе. Лёс пуцёўкі ў першы дывізіён вызначыўся толькі ў апошнім відзе — бегу 4 па 100 м, дзе нашы ўпэўнена апярэдзілі асноўных канкурэнтаў — туркаў. У агульным выніку Беларусь абышла Турцыю, якая была гаспадаром спаборніцтваў, толькі на 2 ачкі. Індывідуальна трэба адзначыць Андрэя Шалоньку, які паказаў свой лепшы час і перамог у бегу 110 м з бар'ерамі. З іншых маладых можна пахваліць таксама спрынтэра Максіма Лыншу — на стометроўцы ён быў толькі трэцім, але пабіў свой асабісты рэкорд. Першыя месцы заваявалі дасведчаныя Сяргей Казлоў (бег на 400 м), Азат Ракіпаў (5 000 м), Леанід Вяршынін (400 м з бар'ерамі), Аляксандр Малашэвіч (кіданне дыска). Ветэранаў належна падтрымалі дэбютанты Кубка Старога свету Вадзім Яўтуховіч (кіданне дзіды) і Андрэй Сінякоў (штурханне ядра), а таксама Ігар Аляксееў (скачкі з шастом) — усе яны першынствавалі ў сваіх дысцыплінах. А малатабоец Дзмітрый Шако, выхаванец наваполацкай школы (яна дала Беларусі Ігара Астапковіча, які зараз трэніруе Шако), хоць выступаў з траўмай, здолеў заняць другое месца. Найбольшыя ж праблемы па традыцыі маем у скачках у даўжыню.

Уладзімір Хільмановіч

Паказальна, што беларуская дзяржаўна-прапагандысцкая машына не ўхапілася за справу. Гэта інстынкт самазахаваньня: хай сабе і палякі, і імпэрыялісты, але як душаць носьбітаў беларускай мовы і беларускай сьвядомасьці, то робяць „аб'ектыўна карысную" справу...

Лёгкія нашы далёкія

Лёс беларусаў Падляшша важны як знак. Калі сківіцы польскай бюракратыі разжуюць і выплюнуць іх, тады ўсе нашы спадзяваньні на Эўропу марныя.

У Польшчы адзін за адным узьнікаюць „камітэты салідарнасьці зь Беларусьсю". Зь Беларусьсю, бясконца далёкай ад сярэдняга паляка, па вуліцах якой гойсаюць белыя мядзьведзі і беларускія шавіністы, з гамэрычным рогатам паядаючы трупы безабаронных палякаў і запіваючы іх бярозавікам.

І ў той жа час у Беластоку працягваецца працэс над сябрамі Праграмнай рады беларускага тыднёвіка „Ніва". Беластоцкія беларусы палякам бліжэйшыя, але й цяжэйшыя. Упарта распускаюцца чуткі, нібыта яны прысвоілі сабе частку ўрадавых датацый. Насамрэч крадзяжу або „адкату", як прызнае і пракуратура, не было. Загнаныя ў кут бюракратычнай марудлівасьцю ў выдзяленьні датацыі, выдаўцы мусілі „расьцягнуць" рэшту грошай на чарговы фінансавы год, замест таго каб спыніць выхад газэты і чакаць рашэньня „зьверху". За гэта і паплаціліся.

Дзевяці з адзінаццаці сяброў Праграмнай рады прапанавалі часткавае прыпыненьне справы з выплатай адносна невялікага штрафу і гадавым выпрабавальным тэрмінам. Такая зьдзелка цалкам укладаецца ў польскае заканадаўства. Але, рызыкуючы страціць значна больш, усе „злачынцы" ад зьдзелкі адмовіліся, настойваючы на поўным апраўданьні ўсіх. Цяпер будзе новы суд.

Як ставяцца да беластоцкай справы польскія палітыкі? Можна было б згуляць „на кантрасьце": у Беларусі Саюз палякаў дажывае апошнія дні, яго актывісты чакаюць рэпрэсій, пашытых, як добры касьцюм, індывідуальна на кожнага, а не прамыслова-аднолькавых, як у Польшчы. Здавалася б, цяпер ідэальныя ўмовы стварыць сабе доўгатэрміновую рэпутацыю, праявіўшы міласэрнасьць ды скамандаваўшы злосным сабакам „Фу!" І тады ўжо глядзець на беларускія ўлады з заслужаным пачуцьцём маральнай перавагі. Але выглядае, што польскім уладам бліжэйшая лёгіка вэндэты, „сымэтрычнага адказу", „вока за вока".

Паказальна, аднак, што беларуская дзяржаўна-прапагандысцкая машына не ўхапілася за гэтую справу. Відаць, гэта інстынкт самазахаваньня: хай сабе і палякі, і імпэрыялісты, але як душаць носьбітаў беларускай мовы і беларускай сьвядомасьці, то робяць „аб'ектыўна карысную" справу. Дзеля гэтага можна часова паступіцца і антыпольскай рыторыкай. Гэтаксама разважаў Сталін, спыніўшы ў 1944 г. наступ на Варшаву, каб даць немцам разграміць польскае нацыянальнае паўстаньне. Значыцца, нашы ўлады сапраўды добра засвоілі ўрокі вайны. Значыцца, яны сапраўды ўмеюць думаць стратэгічна, ня горш за крамлёўскага горца. У адрозьненьне ад нас. Таму яны ўвесь час і перамагаюць.

Лёс беларусаў Падляшша важны як знак. Калі бязьлітасныя сківіцы польскай бюракратыі разжуюць і выплюнуць іх, тады ўсе нашы спадзяваньні на Эўропу марныя. Занятая легалізацыяй гомасэксуальных шлюбаў, эўтаназіі, цкаваньнем „Нівы", пераносам вытворчасьці ў Кітай (каб свае бэйбусы ня пэцкалі рук аніякай працай), падрыхтоўкай перагаласаваньня рэфэрэндумаў па эўраканстытуцыі аж да „слушнага" выніку, выкрэсьліваньнем з гэтай канстытуцыі ўсялякітх згадак пра хрысьціянства, Эўропа здолее дапамагчы толькі некаторым з нас. Тым, хто заплюшчыць вочы на рэальныя праблемы — як беларусаў Польшчы, так і самой Беларусі — і будзе бясконца-бессэнсоўна паўтараць лібэральныя мантры, лісьліва зазіраючы ў вочы заходнім суразмоўнікам.

Алесь Белы

„Наша Ніва" № 23, 24 чэрвеня 2005 г.

На поўначы Еўрасаюза

— 2 —

— А яны ўсе напаўгалодныя ходзяць, да таго прывыклі, — кажа Дарота. — Гляджу на іх, і бярэ мяне зайздрасць. Пахудзець самой цяжка. Ды ўсё бяру з майго агарода. Прыехала 17 гадоў таму, выйшаўшы замуж, дык сама не верыла, як яны ядуць і колькі з таго жыцця смаку маюць: едла ў рот не возьмеш, калі нават і пачастуюць. Калі немагчыма ашчадзіць на доме, на адзежы, дык хоць на ежы!

Ты бачыла, як выглядае Нора? Яна прыехала ў Швецыю дваццаць шэсць гадоў таму. А выйшла замуж за дантыста, дык усё ж рабіла як прыбіральшчыца. Дантыст кінуў жонку з дзіцём для маладзейшай, яна парабіла 26 гадоў, перайшла на пенсію, дачка мае ў цэнтры Гётэборга клініку адновы, у 24 свае гады, пад ёю 30 асоб, а маці ездзіць па свеце. А калі б ты бачыла, як яны ядуць! Нейкія памыі. Ды фігура Норы ў яе 65 гадоў — толькі пазайздросціць.

Нору з сяброўкамі сустракаем у гётэборгскім касцёле Хрыста Збавіцеля. Якраз ідзе польская імша — сучасная касцельная зала паўнюткая. У набажэнстве, якое вядзе ксёндз Яраслаў, прымае ўдзел шмат вернікаў — чытаюць евангелле, спяваюць за амбонам. Ксёндз Яраслаў Данілюк мае цяпер праблемы — „падпаў" шэфам пару дзесяткаў паланійных арганізацый, якія з касцёла забіралі на дзейнасць палову даходу з „тацы". Хочуць збудаваць яшчэ іншы клуб, свой, польскі, дзе будзе капліца. Тут сем тысяч палякаў. Усе грызуцца. Яраслаў, брат-капуцын, год служыў быў у Беларусі.

— Абшмароўваюць Ярка гэтыя камунякі, як толькі могуць! Вось у гэтай бульварнай газетцы, не бяры яе пры людзях у рукі, — асцерагае Крыстына. Яна — па тутэйшых мерках — мільянерка. Штомесяц дае шмат грошай на „Радыё Марыя" і парафію.

Мы, вядома, той „шматлавец", што аплёўвае пастыра, возьмем у рукі, каб параўнаць даныя з яе і з пастырскага ліста а. Яраслава, які абураны тым, што ў гэтым клубе, дзе маюць адбывацца распусныя гульні, мае быць алтар са святынямі. У газетцы „Гонец каталіцкі" сапраўды аж кішыць ад ілжы, як кажуць жанчыны, спажываючы ў кавярні пончыкі з кавай (усе грошы пойдуць на аперацыю вушэй манашкі-катэхеткі, якая аглухла і не можа весці больш за трыццацігадовай навучальнай працы сярод маладых палякаў у Швецыі). Вось, кажуць, ксёндз Яраслаў не хацеў пахаваць аднаго чалавека. Дык гэта ж няпраўда! А газетай кіруе адзін такі, якога добра ведае Дарота. Выехаў на гарбе „Салідарнасці". Сам пасля меліярацыйнай школы, дастаў паперы, што ён журналіст, ад самога Мацярэвіча, што прыязджаў у Швецыю, а раней ягоная маці старалася, каб далі тыя паперы яшчэ ў Польшчы. Рэдактар К. адмовіўся, дык трэба было пану Г. ісці па лініі моцна партыйнай. Вядома, тае партыі, якая пры ўладзе, а прынамсі ў Швецыі асацыюецца са змаганнем за дэмакратыю. Э там, тут, усе, хто пры ўладзе быў, камуністы, — махае рукой Нора. — Людзей столькі, што і ў Беларусі, можна было спрабаваць увесці новую сістэму апякунчай дзяржавы. На польскія грошы беспрацоўнаму тры тысячы злотых, але чалавек як прывязаны. Адзін на аднаго даносяць. На парог чужога не ўпусціць. Нават мы, славяне, мусілі стаць такімі, і насцярожвацца.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Часта нацыю яднае веравызнанне. На паломніцтве ў Оскарштром, Спераду а. Яраслаў

Сядзім так у касцельнай кавярні, п'ем каву. У чорна-белай газетцы — шмат пра папу Яна Паўла II. — Глянь ты, гэты нехрыст піша пра папу: „Лёлек"! Гэты, на здымку пад мухай. Што няхрышчаны ён, добра ведаю, бо ведаю ягоную маці. Жыву столькі часу, што ведаю пра ўсе круцельствы. Шлюбу не мае касцельнага са сваёй жонкай, а дваццацігоддзе ў касцёле адсвяткоўвалі, разам з паўторным касцельным шлюбам! — былая дактаровая трасе з абурэннем фарбаванымі даўгаватымі валасамі. Не дасі ёй 65 гадоў! Дагледжаная! — Яна мачою твар мые, уяві сабе! — шэпча суседка. — Едзе ў цяплейшы клімат, у Балгарыю. Летась была ў Бразіліі. Пенсію выпрацавала. Трэба рабіць 30 гадоў, каб далі. Альбо плаціць штомесяц 1 500 крон (750 злотых) на страхоўку самому. А што ёй рабіць! А мой сусед, Грышка, чуеш, прадаў сваю кватэру ў Гётэборгу, купіў двухпакаёўку ў Борас, „Вольва", а за рэшту — вілу ў Шчэціне. — Калі б маю хату прадаць, дык я два апартаменты купіла б у сябе, у Сасноўцы! Ды якое там жыццё, у гэтым смуродзе!

Да Норы прыязджае сваяк, пільнаваць хату з вялізным агародам, якую яна мае ў Кунгсбацы, калі яна ездзіць сабе па свеце. Сваяк у гэты раз прыслаў заранёў пісьмо: прышлі мне, апрача білетаў туды і назад, тысячу злотых. Сеў ён цяпер на рыбна-варыўную дыету, і не будзе карміцца тым, што пакіне яму яна ў халадзільніку. Неўзабаве пачнецца грылевы сезон, будуць людзі смажыць добрае мяса па агародах. Прывык Ясё з Беластока, што Нора памагае сваякам, штогод па два-тры месяцы сядзіць у гэтым курортным мястэчку, прыбірае дом, сам сабе варыць, корміць ката ды апрацоўвае агарод. Нора купляе добрае мяса па ўцэнцы (польскае добрае мяса прыходзіць у тры разы таннейшае за шведскае, якога ў рот, кажа дама, не возьмеш), гаспадыня заладоўвае аграмадныя халадзільнікі — і мясам, і косткамі, і пладамі, якія Янпенсіянер вырошчвае за лета і восень у яе агародзе. — Я ўсім гэтым і сама кармлюся. Я шаснаццаць гадоў не купіла сабе лякарства, у кіно была два разы, бо за два сеансы ў кіно ці ў аперэту магу купіць білеты на падарожжа ў Польшчу. Не хаджу я ні ў рэстараны, ні ў піўбары нават, а ён, пенсіянер, наведвае іх у нас што і раз, піўцо сабе заказвае, — злуецца дама, бывалая ў свеце. Сам гётэборгскі дом каштуе мне, слухай, самы аплаты, восем тысяч крон (4 тыс. зл.). А калі хто хату наймае! Праўда, самотным дзяржава дае падмогу, столькі, каб на жыццё хапіла яшчэ (на польскія грошы) 1 500 злотых. Ды калі ў сям'і дзяцей няма, дык вялікія падаткі плаціць трэба дзяржаве... А калі хочаш спакойна жыць, дзеці — клопат. Малыя — меншы, вядома. Калі ідуць на студыі, ужо яны „на сваім": бяруць зваротныя стыпендыі. Дзецям былых грамадзян Польшчы, калі схочуць вучыцца на поўдні ЕС, шведская дзяржава дае крэдытныя стыпендыі па 2 000 крон. За тыя амаль 1 000 злотых у Польшчы студэнт пражыць можа. Вядома, калі бацькі вучылі яго роднай мове і ўмее ён па-польску. А з гэтым па-рознаму бывае: каб дзіцяці „мовы не мяшаліся" ды „лягчэй яму жылося", бацькі вучылі яго выключна пашведску...

(працяг будзе)

Міра Лукша

Сведка мінулага

Янка Саласцюк з Чаромхі-Станцыі перакрываў матчын дом у Кузаве. У час рамонту знайшоў на паддашшы клуначак з дакументамі. Калі заглянуў у пажаўцелыя лісткі паперы, выявілася, што гэта дакументы ягонага дзядулі Яна і бацькі Антона. Найстарэйшы дакумент датуецца 1904 г. і выдадзены ён тыпаграфіяй Кіева-Пячэрскай лаўры. Сярод іншых дакументаў знаходзяцца прыватныя дамовы куплі-продажу зямельных участкаў. З распіскі ад 21.02.1922 г. вядома, што жыхар Кузавы Ян Саласцюк уплаціў у Скарбовую касу ў Бельску-Падляшскім 587 зл. належнага падаходнага падатку за 1920-1921 гады. З дагавора, які заключаўся 20 сакавіка 1927 года вядома, што жыхар Кляшчэляў Аляксандр Васілеўскі перадае ў залог Яну Саласцюку за 25 расейскіх рублёў участак пашы ва ўрочышчы Пухава шырыні паўтара сажня палёвага і даўжыні сумежных участкаў па абодвух баках лесу. Прыкмячалася, што Ян Саласцюк у кожнай хвіліне можа патрабаваць ад Аляксандра Васілеўскага вяртання належнай сумы, а калі гэты не заплаціць, дык можа карыстацца участкам пашы як сваёй. Захаваліся даваенныя і пасляваенныя страхавыя полісы. У 1930 годзе ад застрахаванай маёмасці вартасцю 7 340 зл. гадавая складчына складала 29,64 зл. У 1949 годзе за страхаванне каня, вартага 40 000 зл. трэба было заплаціць 1 380 зл. гадавой складчыны. Кашмарам для сялян былі абавязковыя паставкі сельскагаспадарчых прадуктаў. Антону Саласцюку ў 1946 годзе трэба было здаць: 110,55 кг жыта, 21,45 — пшаніцы, 14,85 — ячменю, 14,85 — аўса, 3,30 — грэчкі і проса, 0,92 — ільну, 1,98 — лубіну, 363 — бульбы, 0,66 — гароху, 1,65 — фасолі. Апрача абавязковых паставак селянін вымушаны быў адрабіць шарваркі або заплаціць раўнацэннасць назначаных працадзён. У выпадку невыканання паставак або нестрымання назначанага тэрміну селяніну пагражала ад аднаго года турэмнага зняволення да вышэйшай меры пакарання. Ці гэта верагодна? Лічу, што так, дакументы гэтаму сведкам.

Уладзімір Сідарук

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 003 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2005 r. upływa 5 września 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Свінствы

— У Нямеччыне незвычайную папулярнасць здабывае чарговы выпуск вядомага рэаліты-шоу, якое згодна з прапанаваным зместам можна назваць „Дзік-брадэр". Мільёны наведваючых інтэрнэтавыя старонкі немцаў цэлыя суткі падглядваюць сексуальныя выдрымусы і кампанейскае жыццё статка дзікіх свінней! — звярнуў я ўвагу маёй жонцы, якая з пачкам чыпсаў на каленях узіралася ў праграму „Вялікі Брат". — Гэта, мабыць, цікавей, чым глядзець на гэтых урэдных тыпаў, якіх выбралі невядома чаму.

— А і ты мог бы трапіць у такую праграму, каб пастараўся. Старая распусная свіння. Хоць зарабіў бы крыху, а я ў хаце мела б спакой на тры месяцы.

Не, мабыць, тыя свінствы ў выкананні дзікоў больш цікавыя. Вандруючы па лесе статак дзікоў складаецца з трох дзікоў, трох мацёраў і шматлікіх парасят. Іх справы настолькі цікавяць інтэрнаўтаў, што, мабыць, здабудуць яны большую папулярнасць, чым чалавечы „Біг-брадэр" ці шоу пра сям'ю Озі Осбарна. Такая развязка не была б найгоршая, таму што дзічыная грамада вядзе прыстойнае жыццё, напэўна, не менш паталагічнае, чым людское. Галоўнымі героямі „Дзік-брадэра" з'яўляюцца кныр, якога бульварная прэса называе Кале, ды ягоная ўлюбёніца, мацёра Люіза.

— А ты чуў, што ў Нямеччыне дзікі ходзяць па гарадах? І я нямала ведаю пра свінскае жыццё! Вось у гэтай Нямеччыне, на гэтым гнілым Захадзе, са зруйнаванай прыродай, іх папуляцыя павялічылася амаль у тры разы! Цяпер іх там больш за мільён. Частка дзікоў прыходзіць пад Берлін з Польшчы, іншыя ў Баварыю з Чэхіі. Рыюць агароды і сметнікі пасярод горада! Ну, зусім як людзі.

— Бачыш, і нашы свінні ідуць на Захад!

— Адзін паршук гнаў хлопца аж на другі паверх дома, а аднаму сужонству малады кныр старанаваў дзверы ў хату і скочыў з разбегу ў ложак.

— Доступ да ежы большы ў гарадах, чым у лесе... Да таго шлюбны перыяд працягваўся калісь у дзікоў ад кастрычніка да студзеня, цяпер практычна працягваецца ўвесь год, — нашыя развагі пра свінскае жыццё сведчылі, што жыццё дзікіх свіней нам блізкае.

І вось, спалучэнне жарсцяў, злосці і раздражненасці, пошукаў спажывы і ахвота абараняць сваю тэрыторыю — тое ж усё ёсць ва ўсіх рэаліты-шоу, дзе прымаюць удзел людзі. Таму і дзічыная эксгібіцыянісцкая праграма здабыла такую папулярнасць.

— Ну, ты таксама, апісваючы наша жыццё, немалы эксгібіцыяніст. Але ці ты зорка настолькі, каб прыцягваць чытача?

— А вось, той Кале — зорка! Ягоная індывідуальнасць „мача", тыранізаванне іншых самцоў, выкарыстоўванне чужых самак, папырхванне з пагардай, гатоўнасць да дзеяння гэтак захапілі людзей яго лёсам. Можна і нам падглянуць усё тое на інтэрнэт-камеры на www.wildtiere-live.de. Уключаем? Нямецкія настаўнікі трактуюць старонку як навучальны дапаможнік. Можа, і нам да чаго спатрэбіцца. Ведаеш, немцаў цікавяць не толькі блізкія зносіны дзікоў, можна пабачыць таксама парасятак, напіваючыхся на паваленай мацёры ці змагаючыхся за сваю пазіцыю ў сямейнай іерархіі.

Зося зусім адвярнулася ад тэлевізара, на якім нейкая распусная паненка, каб здабыць зацікаўленне гледачоў, нешматзначна падчапляла чалавечага „мача".

— Я, вось, фанатка не гэтага... самца. Мне падабаецца той худзенькі, якому на галаву ўсе залазяць.

— І сярод дзікоў розныя разявы маюць сваіх фанатаў. Ёсць фан-клуб, які падтрымлівае найбольшых асталопаў, якія да цыцкі не могуць дастацца.

— Эх, ты мой... дзічку-парсючку! — прыцягнула мяне да грудзей Зося. — І я цябе такога выбрала, пашкадавала...

Лукаш Правасуд

Фота БАГУСЛАВА СКОКА

Гарадок, 22-23 ліпеня

Фота БАГУСЛАВА СКОКА

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. негусты аўсяны кісель = 3 _ 2 _ 21 _;
2. веснавы месяц = 1 _ 22 _ 23 _;
3. выніковае заканчэнне шахматнай партыі = 19 _ 10 _ 9 _;
4. фінскі порт на поўначы Батнічнага заліва, Улеаборг = 18 _ 20 _ 7 _ 6 _;
5. зямля не без добрых людзей = 14 _ 15 _ 8 _ 17 _;
6. рух электрычнага зараду ў праваднику або пляцоўка для абмалоту збожжа = 12 _ 13 _ 5 _;
7. злучае галаву з тулавам = 11 _ 4 _ 16 _. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 21 нумара

Выгада, дэкада, зяць, пот, раяль, сажа, сто, сцюжа, цюк.

Рашэнне: **Тады госця паважаюць, як рэдка за стол саджаюць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Васілю Бялькевічу** з Чыжоў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

3.07 – 9.07

Баран (21.03. — 19.04.) Ой, як будуць марыцца грошы, якія павінны былі трапіць у твой кашалёк! Размовы на іх тэму могуць здамінаваць хатняе жыццё. Папраў фізічную кандыцыю. Насі гранат (камень!).

Бык (20.04. — 20.05.) Калі ў цябе ёсць ворагі, не штурхай іх цяпер сваімі рагамі. Не ўваходзь у канфлікты з жанчынамі. Асабліва асцярожны павінны быць Быкі студэнты і навукоўцы, каб нейкі невялікі скандал не лёг ценем на вашай навуковай кар'еры.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Будзеш хадзіць з галавой у хмарках. Чакаюць цябе рамантычныя перажыванні. Шанц на прафесійныя поспехі. Насі аметыст, які прыцягвае шляхетныя пачуцці і яднае.

Рак (22.06. — 22.07.) Ненайлепшы час на раманы, лепш засяроджвайся на працы, якая, асабліва Ракам народжаным у чэрвені, можа прынесці шмат поспехаў і задавальнення. Асцярожна з суполкамі з жанчынамі, якія могуць падставіць.

Леў (23.07. — 22.08.) Шанц патупіць ільвіны эгацэнтрызм і эгаізм, можа і шанц паратаваць душу. Будзеш сардэчны, чалавекалюбны. Развівай уражлівасць яшчэ больш, гэта патрэбна перш за ўсё табе.

Дзева (23.08. — 22.09.) Калі рэалізуеш нейкую здзелку, у якой іграе ролю мастацтва, каханне ці справы жанчын, на поспех можаш разлічваць крыху пазней. Ды які гэта будзе поспех! Калі ты Дзева верасневая — можа быць аж міжнародны! Зважай на ногі і карак.

Шалі (23.09. — 22.10.) Столькі імпэту, што захочаш кінуцца ў вір натужанай, хоць часам без сэнсу, працы, каб разгрузіць тую энергію. Спачатку хвіліну перадумай, каб энергія не пайшла паражняком. Не хадзі напрасткі!

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Муж, жонка, супрацоўнікі могуць табе, Скарпіёне, выставіць рахунак за апошнія гады. Можа, лепш схавацца на гэты час на бязлюддзі? А, можа, пусці ў рух сваю кемлівасць, каб адплаціць за грахі, пакайся раз назаўсёды. Ад цябе залежыць, ці гэта брамка ў неба, ці ў пекла.

Стралец (22.11. — 21.12.) Хоць будзе табе свярбець язык, каб выказваць бескампрамісныя думкі і ўсчынаць скандалы, спрабуй над імі запанаваць, і засяроджвайся на салодкім, бо час добры для будавання і ўзмацнення добрых адносін. Рэнесанс у пачуццях.

Казярог (22.12. — 19.01.) Настаў час на інвестыцыі, але трэба з гэтым ісці да людзей! Калі справа ў фінансах, можа гэта пырснуць як мыльная бурбалка, але ў пачуццях вернецца да цябе гэта як найпрыгажэйшы падарунак ад лёсу.

Вадалей (20.01. — 18.02.) На ўсе фрустрацыі, крыўды і боль найлепшае далёкае падарожжа. Калі грошай замала, пазыч, бо праз нейкі час штосьці трапіць у кашалёк. На героя раману гараскоп прапануе мастака-арыгінала альбо сухога інтэлектуала.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Барані цябе Бог, Рыбка, перад настальгічнымі, дэпрэсіўнымі настроямі! Дбай аб красу, не будзь мяккая! Хтосьці тваімі рукамі схоча разыграць нячыстую гульню, ды ён — не вечны. Як выблытацца — папытайся ў інтуіцыі.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960